Хор імя Цітовіча ☞ 3

Ніва 55

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 21 (2871) Год LVI | Беласток, 22 мая 2011 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 5%)

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Нашай „Ніве” — 55

У падобным крузе людзей, для якіх беларускае слова вельмі важнае і з падобнай мэтай — адзначання шматгоддзя выдавання тыднёвіка беларусаў у Польшчы, сустрэліся мы пяць гадоў таму, ды круг жывых аратых на роднай ніве змяльчэў па прычыне часу. Ды ўсё разам з намі ўсе галоўныя рэдактары, пачынаючы ад Георгія Валкавыцкага, які ў 1956 годзе, 4 сакавіка, выдаў першы нумар тыднёвіка на роднай мове. „Ніва” — як і ля сваіх вытокаў, імкнецца папаўняць архіў памяці перш за ўсё падляшскіх беларусаў. Наша мэта — захаванне беларушчыны.

— Шаноўныя госці „Нівы”, рэдактары, супрацоўнікі, карэспандэнты, — узяў уступнае слова галоўны рэдактар Яўген Вапа. — Цешуся па-сапраўднаму, што надалей беларускае, роднае слова яднае ўсіх нас тут прысутных, так як было гэта ля вытокаў узнікнення газеты ў 1956 годзе. Пасталелі мы на чарговыя гады, але з такой самай нецярплівасцю чакаем паху фарбы кожнага свежага нумара выдання.

Выступілі са словам найстарэйшыя працаўнікі „Нівы” і госці, зачытаны былі віншавальныя лісты ад мітрапаліта Савы і архіепіскапа Сімана. Ліст ад пасла РБ у Польшчы праф. Віктара Гайсёнка зачытаў дырэктар Культурнага цэнтра Беларусі Аляксандр Карачун. Кветкі і віншавальныя гравяртоны ўручылі прадстаўнікі Радыё Рацыя, намеснік прэзідэнта горада Беластока Аляксандр Сасна, дырэктар дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства Анатоль Вап і ўпаўнаважаны падляшскага ваяводы па справах нацыянальных меншасцей Мацей Тэфэльскі. Маршалкоўская ўправа і Прэзідэнт горада Беластока прафінансавалі нашае юбілейнае мерапрыемства.

Георгій Валкавыцкі, заснавальнік „Нівы” і першы галоўны яе рэдактар, прызнаўся:

— Такую падзею як наш юбілей, у 1956 годзе цяжка было б прадбачыць. Калі мы выпускалі першы нумар, нашы калегі з іншых газет нам казалі, што выпусцім пару намароў, і будзе канец. Пяцідзесяты нумар мы ўжо адзначалі як вялікае свята, таму што не апраўдаліся тыя прагнозы! А пачаткі былі нялёгкія, таму што не было кадраў, толькі двух аўтараў нюхала да таго часу газетную фарбу. Прыйшлі аўтары не толькі з Беласточчыны, але і з Варшавы, і з Заходніх зямель... Ставіў таксама я на супрацоўнікаў, на карэспандэнтаў, — пералічваў прысутных, м.інш. Віктара Шведа, — таксама і Аляксандр Баршчэўскі, які вельмі многа ўклаў у развіццё „Нівы”, ад пачатку і да сёння; Юрка Туронак, Мацей Канапацкі, які раскапаў польскія архівы, каб знайсці беларускіх аўтараў... І так з кожным годам раслі мы, не бедавалі. Супрацоўнічала з намі маса карэспандэнтаў. Я цешуся, што некаторыя падтрымліваюць „Ніву” і да сёння, пішуць, я з прыемнасцю чытаю іх допісы.

Злева: Яўген Вапа, Георгій Валкавыцкі, Віталь Луба, Яўген Мірановіч

Злева: Міхась Хмялеўскі, Аляксандр Баршчэўскі, Віктар Швед

Злева: Сакрат Яновіч, Уладзімір Сідарук, Галена Тапалянская

Стаяць злева: Мікола Ваўранюк і Аляксандр Максімюк

Сядзяць злева: Уладзіслаў Петрук, Яўгенія Палоцкая, Валянціна Жэшка, Марыя Федарук, Аляксей Мароз

Вера Леўчук-Валкавыцкая ўспомніла з хваляваннем прозвішчы дзесяткаў карэспандэнтаў, якія пісалі ў родную газету, з усёй Беласточчыны і Польшчы.

Ян Чыквін, старшыня „Белавежы”:

— Па сутнасці беластоцкая „Ніва” была засеяна беларускім словам дзеля таго, каб узрасло беларускае слова... „Ніва” — калыска Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа” і мы ўдзячны лёсу, што так сталася. І як гэта знамянальна, важна для ўсіх нас, што ваш час і наш час доўжыцца і ў новых абставінах.

Аляксандр Баршчэўскі:

— Нашы беларускія арганізацыі радзіліся ў эпосе, якую можна назваць рамантычнай. Мы былі поўныя надзеі на тое, што Беларусь, і тая за мяжой, і ў Польшчы поўнасцю адродзіцца. Я памятаю час, калі „Ніва” выходзіла тыражом 7 тысяч экземпляраў. Ішоў я з Семяноўкі ў Бандары праз Луку, амаль у кожнай клямцы, у кожнай брамцы тырчэла „Ніва” пакладзеная лістаношай. Людзі чакалі гэтага слова, цікавіліся гэтым словам... Быў радасны, рамантычны час. Мы з Віктарам Шведам правялі больш за 1300 сустрэч (пасля Віктар перастаў іх лічыць)... Юрка Валкавыцкі — не толькі класны рэдактар, гэта і выдатны паэт ды празаік. Дай Божа табе, Юрка, найлепшае здароўе, каб ты як найдаўжэй быў паміж намі і працаваў у будучыні. Сённяшнія рэдактары „Нівы” гэта супрацьстаўныя стыхіі: для мяне Віталь Луба гэта сімвал ціхай вады, а Яўген Вапа — бліскучага агню: *Гісторыя зьяднала ў саюзе вечным: Лубу — лагодную ваду з Вапам — агнём бурлівым. Хай сужывуць і верна, і сардэчна да поўнага стагодзьдзя роднай „Нівы”!*

Прафесар Галіна Твараповіч:

— Беларская філалогія Універсітэта ў Беластоку шчыра вітае ўсіх супрацоўнікаў „Нівы” з вашай юбілейнай датай нашага агульнага ўнікальнага штотыднёвіка беларусаў у Польшчы. Нам бясконца дорага тое, што „Ніва” ад самага пачатку свайго існавання выконвае ў імя нацыянальнага духу высакародную культурна-асветніцкую ролю. Самой сваёй прысутнасцю трываліць на Беласточчыне і ў свеце беларускае слова. Жадаю сіл і энергіі, і натхнення ў далейшай працы на карысць беларушчыны...

Падчас нашага свята прыгадалі мы таксама сітуацыю незалежнай журналістыкі ў Беларусі. Старшыня Асацыяцыі беларусіх журналістаў Аляксандр Максімюк зачытаў зварот ад імя беларускіх журналістаў Беласточчыны ў падтрымку калег у Беларусі, між іншым выданняў „Наша ніва” і „Народная воля”, якім пагражае закрыццё. Пасля афіцыйнай часткі музычна-акцёрскае шоў „Цацачная крама” прадставілі вучні з „Гульні ў тэатр” пад кіраўніцтвам Аліны Ваўранюк. Заспяваў новыя і вядомыя песні беларускі бард Зміцер Вайцюшкевіч, які выканаў, між іншым, кранаючую песню на словы Уладзіміра Някляева „Красуня-вясна”.

9 770546 196000

Шлях у тупік

„Запомніце, няма такога народу, які нельга пасадзіць у Бастылію!" — павучальна-катэгарычна сцвярджаў адзін літаратурна-гістарычны персанаж. У рэальнасці скончылася ўсё тым, што французскі народ разбурыў муры той жа Бастыліі ўшчэнт. А вось прыклад з зусім недалёкай і больш блізкай нам гісторыі. Цягам 1982-1983 гадоў у Савецкім Саюзе былі арыштаваны, пасаджаны ў звычайныя турмы і так званыя „псіхушкі" (нібыта лякарні, а насамрэч закрытыя ўстановы прымусовага ўтрымання з катаваннямі) каля чатырох тысяч людзей, якія хоць адным словам дазволілі пакрытыкаваць сацыялістычны рэжым. Гэта быў час кіравання савецкай імперыяй Юрыем Андропавым, старшынём КГБ — структуры, якую яшчэ са сталінскіх часоў сапраўды баяліся. Здавалася, што з іншадумствам скончана самым радыкальным і паспяховым чынам і зараз ужо нішто не перашкодзіць камуністам з Крамля пабудаваць самую „магутную і квітнеючую" дзяржаву ў свеце. Прайшло толькі пару гадоў і ў красавіку 1985 года ўся гэтая ўяўная магутнасць абрынулася нібы картачны домік, бясслаўна рассыпалася ў пыл. Савецкі Саюз сканаў у пакутах і смуродзе.

Але гісторыя нічому не вучыць многіх. Ужо ў нашы дні, амаль праз трыццаць гадоў пасля андропаўшчыны, кіраўнік і ідэолаг Рэспублікі Беларусь публічна заяўляе пра вяртанне гэтай замшэлай цемрашальскай дактрыны. І словы не разыходзяцца з жыццём. Кожны грамадзянін Беларусі мусіць быць узяты пад татальны кантроль. Жорсткая дысцыпліна на працоўных месцах і паўсюдна рэгламентаваныя паводзіны ў вольны час — вось тыя кіты, на якіх павінна грунтавацца „асаблівая" мадэль развіцця нашай дзяржавы. Ды даўно вядома, што чалавек дбайна і рупліва працуе толькі ў дзвюх сітуацыях: калі ён мае законную матэрыяльную зацікаўленасць альбо калі кіруецца моцнай ідэяй. Ідэі кшталту карэйскага „чучхэ" ніяк не прывіваюцца на беларускай зямлі, якая мае ў сваёй гісторыі, як не круці, стагоддзі сярэднявечнай дэмакратыі. А гаспадарчая сістэма ў пару крызісу ўсё больш выяўляе сваю нягегласць і няздольнасць да пазітыўных змен.

Працягваецца палітычная расправа і над іншадумцамі. Суды працуюць нібы канвеер — па распрацаванай і ўжо адладжанай схеме. Нядаўні кандыдат у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Андрэй Саннікаў атрымаў прысуд — 5 гадоў строгага турэмнага зняволення. Інтэлігентны чалавек, адукаваны дыпламат, разумны палітык засуджаны да маральных і фізічных пакут сярод сапраўдных крымінальнікаў-рэцыдывістаў. Засуджаны толькі за тое, што імкнуўся рэалізаваць сваё канстытуцыйнае і выбарчае права, за тое, што законным шляхам хацеў разам з многімі іншымі змяніць сваю краіну да лепшага. Гродзенец Алесь Кіркевіч, адзін з лідараў Маладога фронту, атрымаў 4 гады турмы толькі за тое, што быў на плошчы ў Мінску ў дзень выбараў і, па меркаванні суддзі, „магчыма нанёс адзін удар па дзвярах Дома ўрада". Прыблізна так засудзілі і засудзяць па справе аб так званых „масавых беспарадках" некалькі дзесяткаў мірных грамадзян. А можа яны хочуць пасадзіць у турмы ўсе 40 тысяч, што былі на плошчы 19 снежня, перайсці ад андропаўшчыны да сталіншчыны!? „Няма такога народу, які нельга пасадзіць...". Уражвае, што карныя выракі выносяць пераважна жанчыны-суддзі, жанчыны, пакліканыя, здавалася б, быць маці, жонкамі, крыніцамі міласэрнасці. Але гэта ўжо асобная тэма.

Стратэгічны шлях, які абвешчаны цяпер — прамая дарога ў тупік. Гэта павінны зразумець усе праваднікі рэжыму. Ад іх зараз таксама залежыць, колькі маральных і фізічных страт будзе ў гэтай вайне дзяржавы са сваім народам. Выканаўцы рэпрэсій (кагебэшнікі, міліцыянты, пракуроры, суддзі, чыноўнікі) мусяць разумець таксама, што разгортваючы палітычны пераслед, яны непазбежна самі стануць яго ахвярамі. Толькі за іх, у адрозненне ад несправядліва і нявінна засуджаных патрыётаў Беларусі, ніхто не заступіцца і не памоліцца, іх ніхто не ўспомніць добрым словам, ніхто не захоча ім дапамагаць. Яшчэ не позна, яшчэ ёсць час схамянуцца і не ўдзельнічаць у беззаконні, не распальваць нянавісці і варожасці, не рабіць відавочнага зла, зразумець, што твораць.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Такая гэта гульня

Можаце спадарства сумнявацца, ці гісторыя, якую прыводжу ніжэй, з'яўляецца сапраўднай. Я не маю сумненняў. Пасрэдным доказам яе сапраўднасці ёсць паўтаральнасць, з якой адбываюцца ў гісторыі людства быццам бы справядлівыя войны або ідэі, ператвараючыя ў нішто вялікія цывілізацыі. Пачаўшы ад старажытнасці аж да сучаснасці паўтараюцца яны не таму, што нараджаецца нейкі геній дэструкцыі і знішчэння ці проста незвычайны махляр і ашуканец, зачароўваючы ўсе народы, а таму, што чалавечая натура — нязменная. Не было б Аляксандраў Вялікіх, Напалеонаў, Леніных, Сталіных, Гітлераў, ці ў меншым маштабе — Эдвардаў Геркаў ці Аляксандраў Лукашэнкаў, калі б не нязменнасць чалавечай натуры. Нязменнай з'яўляецца яе падатлівасць на ілюзію.

Мой знаёмы, аматар штукарства, вальтыжыроўкі і ўвогуле цыркавага мастацтва выбраўся калісьці на выступленні вандроўнай трупы, што з'ехала ў Беласток. Забяспечыўся ў вялікую папяровую торбу цукерак-ірысак, бо любіў салодка пацямкаць у час прадстаўлення, выгадна рассеўся ў крэсельцы і замяніўся ў... гледача. Вальтыжыроўка была на найвышэйшым узроўні. Таксама і іншыя паказы. Урэшце на сцэну выйшаў чаканы ілюзіяніст. Прывіталі яго воплескамі, паправіў ён чорную палярыну і так адмыслова перакуліў цыліндр, каб усе маглі пераканацца, што ён пусты. Вядома, ніхто сярод гледачоў не сумняваўся, што пад другім дном капелюша дыхае запхнуты туды грызун. Таму што падманваючыя і падманваныя маюць гэта на ўме, што фальш неіснуючага труса з'яўляецца зверху заяўленай праўдай. У іншым выпадку гэтая гульня не мела б сэнсу. Так вось калі штукар дастаў з цыліндра труса, узнагародзілі яго воплескамі. Аднак, на збянтэжанасць яго, бо ж не гледачоў, што гатовыя прыняць кожную ілюзію за праўду, наколькі давяраюць, што не перакрочвае яна межаў нейкай дамоўленасці, з цыліндра віхінуўся страшэнны тыгр, учэплены кіпцямі за трусавы азадак. Ну добра, спытаецца хтосьці, а чаму тыгр? А чаму, пытаюся — трус?

Вядома, гледачы ўзнагародзілі гэты паказ апладысментамі. Не мелі ж сумненнняў, што яны толькі ўдзельнікі зіхатлівай штучкі, таму збялелы твар штукара палічылі момантам далейшай гульні. І што ж адбывалася далей? Воплескі ў глядзельнай зале выклікалі ў тыгры найпрымітыўнейшыя інстынкты, з-за чаго паглынуў ён пры публіцы і труса, і ашарашанага штукара. Захапленне публікі дайшо да зеніту. Фальш, быўшы ў прадпасылцы праўдай, тым больш верагодны, чым больш у ім фальшывых прадпасылак. Быццам на пацвярджэнне гэтага раз'яраны тыгр кінуўся на публіку. Ілюзія заварожвала! Усе з захапленнем ёй паддаліся, хоць звер жэр гледача за гледачом. Незалежна ад гэтых страшных здарэнняў ніхто не сумняваўся ў тым, што ў фінале выплюне ён усіх зачараваных штучкай, хоць добра памятых, ахвяр, за імі засліненага труса, далей пакамячаны цыліндр і задаволенага сабою ілюзіяніста; ніхто не сумняваўся, што той у фінале схопіць абжору за хвост, укіне яго ў цыліндр і шчасліва кончыць свой нумар. Можа таму быўшыя яшчэ жывымі гледачы далей пяялі ў захапленні ад бестыі, уздымаючы ў яе гонар воклічы абажэння, а некаторыя, найбольш прагныя таннай славутасці, нават падкладваліся пад яе акрываўленыя клыкі і кіпцюры. Вось якая была гульня!

На канец жахлівая цішыня запанавала ў цырку. Мой знаёмы нервова засунуў руку па ірыску, ды папяровая торба была пустая. Яшчэ горш: непадалёк ад яго, ледзь на тыграў скок, цікаваў... канец гэтай гісторыі. Не думаючы, мой сябра надзьмуў папяровую торбу і стрэліў ёю як з петарды! Ці выкліканы такім чынам грукат напалохаў звера — невядома. Невядома таксама, да чаго даходзяць межы ілюзіі. Затое вядома, колькі такіх бестый стварыла людская ўява. Хопіць спаслацца на Гісторыю. А што з бестыяй? А яна надалей разгульвае па свеце. Чытач ужо ў гэтым не сумняваецца.

Мірасаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Дзень Еўропы

Калі ў консульстве Рэспублікі Беларусь адзначалі 66 гадавіну заканчэння II сусветнай вайны, я трапіў на беластоцкі Гарадскі пляц пад ратушшу на флэшмоб. Даведаўся я аб гэтай акцыі, як гэта звычайна бывае, з інтэрнэту. Для няведаючых тлумачу, што флэшмоб (з англійскай: „вокамгненны тлум") гэта акцыя, у якой удзельнічаюць незнаёмыя людзі, якія ведаюць толькі час і агульнае планаванае дзеянне, і больш-менш яго месца. Такія флэшмобы выдумалі ньюёркцы. Першая такая акцыя адбылася ў 2003 г. Тады перад адным магазінам папулярнай сярод амерыканцаў гандлёвай сеткі скліканыя па інтэрнэце дапытваліся досыць нахабна ў прадаўцоў пра „дыванчык кахання для камуны". Чарговыя флэшмобы заключаліся м.інш. на паклонах агромнай фігуры плюшавага дыназаўра ў цацачнай краме, пляскані ў далоні ў эксклюзіўным гатэлі ці агляданні фіктыўнага прадстаўлення. У Польшчы славутай пару гадоў таму была акцыя ў Радаме, дзе пару дзесяткаў асоб захаплялася... дасканаласцю булак з сырам. Як прыкмецілі спецыялісты па флэшмобах, некаторыя фірмы хацелі выкарыстаць гэтую задуму для камерцыйных мэт, што — як адзначаюць — супярэчыць іх ідэалогіі, паколькі іх перадумовай з'яўляецца дзеянне выключна для прыемнасці і не могуць яны мець ніякай іншай мэты.

Таму я здзіўлены стаяў на беластоцкім Гарадскім пляцы, дзе асоб трыццаць (галоўным чынам вучні гімназій), неміласэрна фальшуючы, адспявала з картак бетховенскую „Оду да радасці", значыць, гімн Еўрасаюза, у руках трымаючы сцягі Польшчы і Еўрасаюза. Адразу прыйшло мне ў галаву, што гэты флэшмоб гэта не флэшмоб. Была ж вядомай мэта гэтага перформенсу: адзначыць святкаванне Дня Еўропы, вызначанага кіраўнікамі ЕС на сустрэчы ў вярхах у Мілане ў 1985 г. Адна з арганізатарак акцыі Агнешка Кліма тлумачыла зацікаўленым журналістам: „Арганізуючы гэты флэшмоб мы хацелі заахвоціць беластачан да выказання свайго пачуцця ідэнтыфікацыі з іншымі еўрапейскімі краінамі".

Маладая ўдзельніца мерапрыемства, у якой спыталіся, чаго прыйшла на пляц, сказала: „Бо Беласток таксама ў Еўропе".

Адзін мой знаёмы фотарэпарцёр адной з беластоцкіх газет, фанат нестандартных імпрэз, не хаваў абурэння: „Гэта ніякі не флэшмоб. Тут ёсць прадпасылка, ідэя. А ў флэшмобах гаворка пра поўную абстрактнасць прадпасылкі!"

Ну, што ж, мабыць людзі еўрадэпутата з Падляшска-Вармінска-Мазурскай акругі Кшыштафа Ліска (ГП), што сарганізавалі гэтую акцыю, штосьці там чулі пра флэшмобы і хацелі быць прагрэсіўнымі, каб так, па-сусветнаму, быць бліжэй сучасных таксама і еўрапейскіх тэндэнцый. Толькі што выйшла — як часта бывае ў Беластоку — упоперак ідэі. Тым не менш пры нагодзе Дня Еўропы прачытаў я на адным з сайтаў: „Інтэграцыя Еўропы не наступіць у адзін дзень ані ў некалькі дзесяцігоддзяў. Надалей ёсць з гэтым шматлікія недахопы і вядомыя хібы. Працэс, які пачаўся пасля II сусветнай вайны, надалей у пачатковай фазе. У мінулым высілкі дзеля з'яднання Еўропы абапіраліся на дамінацыі адной групы над іншай. Гэтыя спробы не маглі прынесці трывалых вынікаў, паколькі заваяваныя народы мелі толькі адно імкненне: вярнуць сабе свабоду. Сёння амбіцыі цалкам адменныя: збудаваць такую Еўропу, у якой шануюцца свабода і ідэнтыфікацыя ўсіх стваральных яе народаў. Толькі дзякуючы такому задзіночанню Еўропа можа пакіраваць сваім лёсам і адыграць пазітыўную ролю ў свеце". Гэтую ідэю перадаю еўрадэпутату Кшыштафу Ліску і яго супрацоўнікам па беластоцкім „вокамгненным тлуме". Можа пры нагодзе наступнага Дня Еўропы, тут у Беластоку (ля варот усходняй Еўропы, прыцягванай у ЕС), варта пачаць размову на гэтую тэму.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

У пасхальнай атмасферы

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Міжнародны фестываль „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі" праходзіў у гэтым годзе ў юбілейнай атмасферы. Яго арганізатары — Грамадскі арганізацыйны камітэт і Аб'яднанне „Любіцелі царкоўнай музыкі" — з дапамогай СМІ, друкаваных матэрыялаў, свайго сайта і выстаўкі напамінулі пра трыццацігадовую гісторыю канцэртаў царкоўнай музыкі, якія спачатку арганізаваліся ў Свята-Мікалаеўскай царкве, а пасля ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы. З цягам часу пераўтварыліся яны ў агульнапольскае, а пасля і міжнароднае мерапрыемства. Сёлетні выпуск фестывалю, які праходзіў пад патранатам прэзідэнта РП Браніслава Камароўскага (асабіста наведаў ён мерапрыемства ў мінулым годзе), адбываўся ў гайнаўскім саборы з 8 па 14 мая. Вылучаўся ён подыхам маладосці, паколькі сярод харыстаў было многа моладзі і дзетак, якія спевам славілі Бога і Багародзіцу. З нагоды юбілею ў Гайнаўку былі запрошаны, між іншым, пераможцы папярэдніх фестываляў, а высокі мастацкі ўзровень выканання хароў з розных краін Еўропы суправаджаўся малітоўнай ангажаванасцю харыстаў. У час адкрыцця фестывалю малітвы за яго паспяховасць узначаліў мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава, які падвёў вынікі трыццацігадовага перыяду арганізавання мерапрыемства царкоўнай музыкі. Першаіерарх падзякаваў усім людзям, якія працавалі ў карысць фестывалю.

Публіку захапіў Дзяржаўны хор Рэспублікі Беларусь імя Цітовіча з Мінска — лаўрэат першага месца сярод прафесійных хароў

Спяваюць трыццаць гадоў

— Гэта тут, у гэтым горадзе, у невялічкім драўляным храме ў велікодны перыяд, 30 гадоў таму распачалі тады малую, а сёння вялікую справу — царкоўнае спяванне. На працягу 30 гадоў фестываль стаў нашым праваслаўным адказам на канзумерызм сучаснага жыцця. Ніхто ў нас не думаў, што малы горад на акраіне Белавежскай пушчы стане вядомым ва ўсім свеце і да яго будуць прыбываць царкоўныя хары з усходу, захаду, поўначы і поўдня Еўропы, а нават з іншых кантынентаў, напрыклад, з Афрыкі, Азіі, — сказаў мітрапаліт Сава. — Мінае 30 гадоў працы ў духу царкоўнай музыкі, а Гайнаўку цяжка ўявіць сабе без фестывалю. Фестываль гэта не толькі сустрэчы добрых рамеснікаў, гэта свята людзей, спяванай малітвы, гэта багаслужба пасхальнай радасці.

На адкрыцці фестывалю выступіў хор Падляшскай філармоніі і оперы з Беластока. Мерапрыемства ўдастоілі епіскап сямятыцкі Георгій, шматлікія святары, парламентарыі, замежныя дыпламаты, шматлікія самаўрадаўцы і прадстаўнікі многіх устаноў, паколькі гайнаўскі фестываль фінансава падтрымліваюць мясцовыя самаўрады і прыватныя спонсары. Міністр Канцылярыі прэзідэнта РП Мацей Клімчак зачытаў ліст ад прэзідэнта Браніслава Камароўскага, у якім прэзідэнт адзначыў юбілейны характар гайнаўскага фестывалю і яго ўклад у развіццё культуры Польшчы. Хаця гайнаўская публіка асабліва чакала выступлення свайго выканаўцы — Маладзёжнага хору Свята-Троіцкага сабора, з вялікай увагай сачыла таксама за выступленнямі шматлікіх прыхадскіх хароў і свецкіх выканаўцаў.

— Сёлетняя сустрэча з царкоўнай музыкай выключная, бо адбываецца трыццаты раз. Гэта выклікае святочны характар, спрыяе рэфлексіі, стварае нагоду для падвядзення вынікаў і падзякавання ўсім тым, якія на працягу 30 гадоў давалі свой уклад у ладжанне гайнаўскага фестывалю. Давайце вучыцца верыць, што сэнсам з'яўляецца не толькі разгляданне мінулага, але безупынная работа ў карысць будучага існавання. Давайце вучыцца верыць, што тое, што важнае, прыгожае і добрае, заўсёды перад намі, — заявіў дырэктар фестывалю, мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч.

У час конкурсных слуханняў выступіла каля трыццаці хароў з Польшчы, Беларусі, Расіі, Украіны, Балгарыі, Сербіі, Грэцыі і Галандыі.

Усе хары з Беларусі сталі лаўрэатамі

— Свята-Троіцкі сабор захапіў нас сваёй акустыкай і прыгажосцю. Мы, як акадэмічны хор, можам паглядзець выступленні іншых і павучыцца ад іх, а вопыт і псіхалогія выступання на вялікім мерапрыемстве будзе мець вялікае значэнне ў будучыні. Мы ўжо пасябравалі з хорам з Любліна, паявілася нават ідэя супольнага праекта, — сказала Ірына Пякарская, дырыжор Хору педагагічнага аддзялення Беларускай музычнай акадэміі з Магілёва, які заняў першае месца ў катэгорыі акадэмічных хароў. На высокім мастацкім узроўні выступілі таксама тры іншыя хары з Беларусі, а два з іх перамаглі ў сваіх катэгорыях. Сярод дзіцяча-маладзёжных хароў займальна выступілі і занялі першае месца дзяўчаткі з дзіцячага хору Прыхода Усіх беларускіх святых з Гродна — вучні і выпускнікі нядзельнай школы, якія дабіваліся ўжо поспехаў на міжнародных фестывалях царкоўнай музыкі ў Беларусі.

Вельмі ўдала выступіў Хор педагагічнага аддзялення Беларускай музычнай акадэміі з Магілёва — лаўрэат першага месца з ліку акадэмічных хароў

Людзей, сабраных у Свята-Троіцкім саборы, зацікавілі таксама лаўрэаты трэцяга месца — маладыя людзі з хору „Адраджэнне" з Гомеля, які таксама быў створаны пры нядзельнай школе Прыхода святых апосталаў Пятра і Паўла. Спачатку быў гэта дзіцячы хор, пасля дзявочы, а цяпер лічыцца маладзёжным мяшаным хорам і дзейнічае пры Гарадскім доме культуры ў Гомелі. Першае месца ў катэгорыі прафесійных хароў заняў Дзяржаўны хор Рэспублікі Беларусь імя Цітовіча з Мінска, які захапіў публіку і журы сваёй віртуознасцю. На фестывалі былі прызначаны толькі два індывідуальныя вылучэнні, і яны трапілі ў рукі беларусаў — салісткі Алесі Ненартовіч з дзіцячага хору з Гродна і дырыжора Ірыны Пякарскай з Магілёва.

Прыцягвае фестывальная атмасфера

— Зараз фестывальная атмасфера такая, якая была 10-15 гадоў таму назад, калі я часцей пабываў на гэтым мерапрыемстве. Выступленні хароў у царкве выклікаюць асаблівае ўражанне і духоўную атмасферу. Я бачу, што частка людзей з вялікай увагай слухае царкоўны спеў у саборы. Вакол царквы людзі размаўляюць на розныя тэмы, часта аб царкоўных спевах і хрысціянстве. Фестывальны дух аб'ядноўвае ўсіх, людзі вяртаюцца з фестывалю ўзбагачаныя духоўна, — гаварыў Дарафей Фіёнік, старшыня Аб'яднання „Музей малой айчыны" ў Студзіводах. Калектыў „Жэмэрва" з гэтага музея ўдала праспяваў у час конкурсных слуханняў паралітургічныя песні, запісаныя ад жыхароў Гайнаўшчыны і Бельшчыны.

— Паралітургічныя песні, з якімі мы сёння выступілі, старыя, бо ім можа стодзвесце гадоў. Стваралі іх нашыя больш адукаваныя людзі, некаторыя, запісаныя на царкоўнаславянскай мове, хутчэй за ўсё манахі ці рэгенты. Гэтыя творы таксама можна лічыць нашай народнай творчасцю, якую мы запісалі і ўключылі ў наш рэпертуар, — сказала Анна Фіёнік, кіраўнік „Жэмэрвы", якая за цікавае выкананне нестандартных песень атрымала вылучэнне ў катэгорыі дзіцяча-маладзёжных выканаўцаў. Вылучэнні атрымалі таксама нашы прыхадскія хары са Свята-Троіцкага сабора ў Гайнаўцы і з Орлі, а трэцяе месца ў гэтай катэгорыі заняў Маладзёжны хор Свята-Георгіеўскага прыхода з Беластока. Сярод іншых хароў трэцяе месца заняў Мужчынскі камерны хор імя Багдана Анісімовіча з Супраслі. Наведвальнікі фестывалю маглі паглядзець выстаўку „Бязгучны спеў фатаграфіі", наладжаную ў Гайнаўскім доме культуры. На ёй можна было ўбачыць здымкі з розных выпускаў фестывалю, у галоўным аўтарства фестывальнага фатографа Збігнева Дзванкоўскага. У ніжняй царкве Свята-Троіцкага сабора можна было паглядзець выстаўку „Манаства". Удзельнікі фестывалю выступілі таксама з канцэртамі царкоўнай музыкі па-за Гайнаўкай, а ў Асяродку лясной адукацыі „Ягелонскае" каля Белавежы чарговы раз выступілі хары са свецкай музыкай. Адзін са знатакоў царкоўнай музыкі меркаваў, што хутчэй за ўсё змаганне за галоўную ўзнагароду фестывалю будзе адбывацца паміж Хорам імя Палкіна Харкаўскай філармоніі (Украіна), які лічыцца адным з самых лепшых хароў Украіны, а славутым Дзяржаўным хорам Рэспублікі Беларусь імя Цітовіча з Мінска.

— Сёлета высокі ўзровень выступленняў і зараз цяжка сказаць хто можа перамагчы сярод прафесійных выканаўцаў, — заявіў перад абвяшчэннем вынікаў прафесар Міхаіл Дрынеўскі, які 35 гадоў з'яўляецца мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам Дзяржаўнага хору Рэспублікі Беларусь імя Цітовіча. Пасля аказалася, што ўзнагароду Гран-пры атрымаў Хор імя Палкіна Харкаўскай філармоніі, які здабыў самае вялікае прызнанне конкурснай камісіі за музычнае мастацтва. Першую ўзнагароду сярод іншых хароў атрымаў Хор духавенства Варшаўска-Бельскай епархіі, а з ліку прыхадскіх выканаўцаў перамог Кафедральны хор Прыхода св. Марыі Магдаліны з Варшавы.

Варшава, 13 мая 2011 г.

Праграмная рада Тыднёвіка беларусаў у Польшчы „Ніва" Беласток

З нагоды юбілею 55-годдзя Тыднёвіка „Ніва" пасылаю найлепшыя пажаданні і віншаванні.

З Божага благаславення „Ніва" святкуе ўжо 55 год свайго існавання. Няхай міласэрны Бог благаславіць Вам і на наступныя гады, каб Ваш труд прычыніўся для распаўсюджвання беларускай мовы, культуры, звычаяў і інфармацыі.

Рэдакцыі, Чытачам і Сімпатыкам „Нівы" жадаю поспехаў і ўсякага дабра на кожны дзень.

З архіпастырскім благаславеннем
+ Сава
Мітрапаліт Варшаўскі і цэлай Польшчы

Лодзь, 10.05.2011 г.

Праграманая рада Тыднёвіка „Ніва" ў Беластоку

Хрыстос Уваскрос!

55 гадоў „Ніве"! Ды не старая Яна і не старэе Яна! Якія ж Дзяўчаты-Паненкі старэюць?.. Кіньце!

Проста, трошкі паўзраслела, ды і толькі... „Ніва", Ты ж памятаеш, як нас, у свой час, Ты прыгарнула на сваіх старонках, нашы вершы і апавяданні друкавала?.. Мы Т а б е ўдзячны, да канца дзянькоў сваіх...

Будзь, жыві, словам родным напамінай усім, што Родны Кут за ўсё наймілейшы!

МНОГАЯ, ТАБЕ, ЛЕТА!

С і м а н,
Архіепіскап Лодзінскі і Пазнанскі, Лодзь,
якога апавяданні калісь Ты, „Ніва" Дарагая, так сардэчна выпускала ў свет.

Варшава, 14 мая 2011 года

Праграмнай радзе Тыднёвіка беларусаў у Польшчы „НІВА"

Дарагія сябры!

Прыміце самыя шчырыя віншаванні з нагоды 55-годдзя заснавання Тыднёвіка беларусаў у Польшчы „НІВА", а таксама дазвольце выказаць усім супрацоўнікам рэдакцыі словы глыбокай павагі за шматгадовую і самаадданую працу па захаванню і развіццю беларускасці.

Упэўнены, што Ваша праца і надалей будзе спрыяць падтрымцы высокага аўтарытэту беларускай меншасці ў Польшчы, з'яўляцца ўзорам прыхільнасці і любові да Бацькаўшчыны.

Хацеў бы адзначыць станоўчую дзейнасць „НІВЫ" па інфармацыйнаму забеспячэнню і асвятленню на сваіх старонках усіх мерапрыемстваў з удзелам беларускіх дыпламатаў, якія працуюць у Польшчы, што безумоўна спрыяе развіццю не толькі беларускай культуры і адукацыі ў краіне, але і фарміраванню добрасуседскіх беларуска-польскіх адносінаў.

Жадаю ўсім супрацоўнікам „НІВЫ" моцнага здароўя і жыццёвага аптымізму на многія гады, шчасця і дабрабыту Вам і Вашым блізкім, поспехаў у штодзённай і творчай дзейнасці.

З павагай,
Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча
прафесар Віктар Гайсёнак

З янычараў ніколі не было і не будзе гаспадароў

Шаноўныя сябры і госці „Нівы", рэдактары, журналісты, супрацоўнікі, карэспандэнты!

Як не глядзі, а мінула ўжо пяць гадоў ад нашай апошняй юбілейнай сустрэчы. Яшчэ стаяць перад вачыма і заселі ў душы выразныя ўспаміны мінулых святкаванняў, а тут сустракаемся ўжо на пяцідзесяціпяцігоддзі тыднёвіка беларусаў у Польшчы „Ніва". Цешуся па-сапраўднаму, што надалей беларускае, роднае слова яднае ўсіх нас тут прысутных, так як было гэта ля вытокаў узнікнення газеты ў 1956 годзе. Пасталелі мы на чарговыя гады, але з такой самай нецярплівасцю чакаем паху фарбы кожнага свежага нумара выдання. І вялікім гонарам для нас сёння ёсць тое, што кожны чацвер у рэдакцыі з'яўляюцца ейныя сябры, каб з нескрыванай радасцю гартаць і прачытваць старонкі сваёй газеты. І верныя чытачы ва ўсёй Польшчы і свеце змогуць атрымаць эфекты нашай працы. Не ўсё атрымліваецца часамі так як бы мы хацелі. Не зможам бываць усюды, дзе адбываюцца цікавыя і важныя падзеі. На дванаццаці старонках не памесцім усіх тых матэрыялаў, якія хацелася б паставіць у кожны нумар. Але заўсёды пры складанні нумара найважнейшым быў і ёсць наш беларускі погляд і вера, што самае важнае і бясцэннае — гэта адказнасць за далейшую прысутнасць беларускасці ў гэтай частцы зямлі. Але адказнасць за беларускасць і роднае слова — памятайма — гэта не толькі справа адной рэдакцыі „Нівы". На працягу менавіта гэтых пяцідзесяці пяці гадоў беларуская нацыянальная меншасць у Польшчы, менавіта дзякуючы тыднёвіку, атрымала аграмадны самаадукацыйны шанц. У тым, ці з яго скарыстала і карыстае, гледзячы на адбываючыеся вакол грамадскія працэсы, часам можна засумнявацца. З янычараў ніколі не было і не будзе гаспадароў. Таксама, а можа для нас і найважнейшае, гаспадароў беларускага слова і пісьменства. Нягледзячы на сваё беларускае нацыянальнае паходжанне і атрыманую адукацыю, у палоне духоўнай, нацыянальнай безадказнасці знаходзяцца шматлікія асобы, якія маюць рэальнае ўздзеянне на грамадска-культурныя працэсы ва ўсходняй Беласточчыне. Яны, відаць, не разумеюць, што без беларускай мовы ў самаўрадава-адміністрацыйным жыцці і друкаванага на ёй і чытанага імі слова, нашу малую Бацькаўшчыну чакае незайздросны лёс. Ніхто за нас, саміх беларусаў, не будзе купляць „Нівы" і іншых выданняў. Калі зразумеем самую простую адказнасць за сваё нацыянальнае, тады і іншыя беларускія справы таксама лягчэй будзе вырашаць.

Ад 1956 г. людзі „Нівы", маю тут на ўвазе ўсю ніўскую сям'ю, вераць у сваё роднае слова. Хачу тут усім прысутным рэдактарам, журналістам, карэспандэнтам за ўсё гэта падзякаваць. Без Вашай працы і заангажавання ў роднае нашмат горш выглядалі б вынікі нацыянальнага перапісу ў 2002 годзе. Зараз таксама да 30 чэрвеня ідзе менавіта такі перапіс. Не будзе „Нівы", калі не будзе беларусаў у Польшчы. Але і беларусы ў Польшчы будуць маланкава асімілявацца, калі не будзе „Нівы".

Мы сабраліся на святкаванне, каб у так дастойнай кампаніі паўспамінаць мінулае, але і набрацца сіл для далейшай працы на беларускай ніве. Жадаю тут прысутным, каб з тыднёвікам „Ніва" надалей узрасталі чарговыя пакаленні беларусаў у Польшчы, а рэдакцыі прыбывалі чытачы, якім нашы журналісты і карэспандэнты будуць пісаць і дасылаць самыя цікавыя матэрыялы. Развітваюся традыцыйным заклікам: «Да чарговых юбілеяў. Жыве „Ніва"»!

Яўген ВАПА
Беласток 2011-05-14

Заява

Беларусы Польшчы і журналісты згуртаваныя ў Асацыяцыю беларускіх журналістаў выказваюць свой рашучы пратэст супраць пераследу журналістаў у Рэспубліцы Беларусь ды спробаў беларускіх улад закрыць дзве незалежныя газеты — «Народная воля» і «Наша ніва».

19 снежня 2010 года ў Беларусі прайшлі прэзідэнцкія выбары. Увечары некалькі дзесяткаў тысяч беларусаў выйшлі ў цэнтр Мінска запратэставаць супраць непразрыстасці выбарчага працэсу і фальсіфікацый вынікаў выбараў. Супраць дэманстрантаў беларускія ўлады кінулі спецпадраздзяленні Міністэрства ўнутраных спраў, якія ўчынілі над дэманстрантамі жорсткую расправу.

У турмах і следчых ізалятарах Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі аказаліся сотні беларусаў — апазіцыйныя кандыдаты ў прэзідэнты, сябры іх выбарчых штабоў, журналісты, якія асвятлялі выбарчыя і паслявыбарчыя падзеі, грамадскія актывісты, звычайныя беларусы, якія прыйшлі выказаць сваю нязгоду з палітыкай беларускіх улад.

Грамадскія арганізацыі і незалежныя выданні ў Беларусі перажылі пасля 19 снежня беспрэцэдэнтную хвалю рэпрэсій — арышты, вобшукі ў офісах і прыватных кватэрах, канфіскацыі арганізацыйнай тэхнікі і маёмасці, крымінальныя справы ў судах. Пераслед гэты цягнецца па сённяшні дзень, калі фактычна завяршаецца ўжо пяты месяц ад падзей 19 снежня.

Ірына Халіп — журналістка і жонка экс-кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава, Павал Севярынец — публіцыст і кіраўнік выбарчага штаба экс-кандыдата ў прэзідэнты Віталя Рымашэўскага — супраць іх адбываецца суд па крымінальнай справе за ўдзел у «групавых дзеяннях, што груба парушаюць грамадскі парадак». Андрэй Пачобут — журналіст «Газеты выборчай», абвінавачаны за «абразу» і «паклёп» у адносінах да прэзідэнта, чакае на разгляд сваёй справы. Барыс Гарэцкі — мінскі карэспандэнт Беларускага Радыё Рацыя, за выкананне сваіх пафесійных абавязкаў адсядзеў 14 дзён адміністрацыйнага арышту. Гэта самыя яркія і паказальныя прыклады расправы беларускіх улад са свабодным словам.

Акрамя гэтага, Міністэрства інфармацыі Беларусі робіць захады па закрыцці дзвюх незалежных газет — «Народная воля» і «Наша ніва», ставіўшы ім у закід вынесеныя раней афіцыйныя папярэджанні.

Беларусы Польшчы і журналісты згуртаваныя ў Асацыяцыю беларускіх журналістаў заклікаюць беларускія ўлады спыніць пераслед журналістаў і незалежных выданняў у Беларусі, спыніць усчатыя супраць журналістаў, грамадскіх актывістаў і экс-кандыдатаў у прэзідэнты крымінальныя справы, вызваліць з турмаў вязняў асуджаных па палітычных матывах.

Беларусы Польшчы і журналісты згуртаваныя ў Асацыяцыю беларускіх журналістаў лічаць недапушчальным, што ў Беларусі свабода слова залежыць ад волі чынавенства і міністэрскіх клеркаў. Мы жывем у краіне, дзе права свабодна выказваць свае погляды, выдаваць і распаўсюджваць незалежныя выданні гэта фундамент, на якім узрастае і развіваецца дэмакратычнае грамадства і дзяржава ды гэткай жа хочам бачыць Рэспубліку Беларусь.

Беласток, 14 мая 2011 г.

Беластоцкай „Ніве" — 55 гадоў

Першы нумар тыднёвіка беларусаў Польшчы „Ніва" выйшаў у 1956 г. Нягледзячы на жорсткую цэнзуру, якая панавала ў тыя часы, з'яўленне першага перыядычнага выдання на роднай мове стала адным з галоўных фактараў паваеннага гуртавання беларускай інтэлігенцыі ў Польшчы.

Дзясяткі тысяч беларусаў Польшчы пабачылі і пераканаліся, што яны маюць правы і павінны шанаваць сваю культуру, звычаі, абрады.

Рэдакцыя „Нашай Нівы" віншуе калегаў з юбілеем і зычыць і надалей заставацца ў фарватэры беларускага грамадскага жыцця ў Польшчы.

Сто лят!

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Памяць без межаў

Сёлетняе святкаванне 66 гадавіны Дня перамогі ў Беластоку 8 мая не адбылося. Таксама не было асаблівых агульнапольскіх урачыстасцей. Затое 9 мая, якое ў Польшчы адзначалася як Дзень Еўропы, памяць загінуўшых у час II сусветнай вайны традыцыйна была ўшанавана на беластоцкім Гарадскім могільніку. Гэта дзякуючы перш за ўсё галоўнаму арганізатару ўрачыстасцей — Генеральнаму консульству Рэспублікі Беларусь.

Перад мемарыяльнай табліцай у гонар салдат, змагаючыхся ў час апошняй вайны ў радах Савецкай Арміі і загінуўшых у час вызвалення Беласточчыны, паявілася пару дзесяткаў асоб, галоўным чынам старэйшых людзей. Святары чатырох веравызнанняў прамовілі кароткія жалобныя малітвы (сёлета не было духоўнага ад мусульман). Раней генеральны консул РБ у Беластоку Аляксандр Берабеня звярнуўся да сабраных:

— Не дачакаліся іх маці. Не дачакаліся іх браты, сёстры і жонкі. Шмат крыві пралілося ў час вызвалення Беласточчыны.

Адзначыў:

— Народы нашых краін пралілі нямала крыві ў змаганні з гітлераўскім фашызмам. Кожны трэці беларус аддаў сваё жыццё за свабоду і незалежнасць сваёй айчыны. У памяці няма межаў. Таму сёння аддаем пашану тым людзям, якія ахвяравалі сваё жыццё за вызваленне сваіх краін.

Былі ўскладзены вянкі і букеты квецтак. Сярод дэлегацый былі: прадстаўнік падляшскага ваяводы (Марэк Лібэрадзкі, адказны ў Падляшскай ваяводскай управе за справы ветэранаў) і намеснік прэзідэнта Беластока Аляксандр Сасна ды прадстаўнікі беларускай і польскай памежнай аховы, фірмы „Газпрам", Мілейчыцкай і Нарваўскай гмін, БГКТ. Партыі польскай палітычнай сцэны прадстаўлялі толькі дзеячы СЛД.

Цяперашнія беластачанкі Марыя Влашынская і Люба Кравель расказвалі „Ніве":

— Засталося нас шасцёра маленькіх дзяцей. Мой бацька загінуў у 1944 годзе. Застрэлілі яго каля Нараўкі. Калі б павезлі ў Ляўкова, жыў бы, бо там у яго было шмат калегаў. Калі прыйшлі немцы, майго дзедку пабілі кіямі ад плота. Пасля мама папрасіла трох людзей, двух сваякоў і суседа, і пайшлі шукаць майго бацьку. Знайшлі яго ў лесе, прыкрытага ялінай. Да сёння памятаю, як тату прывезлі з таго лесу, а пад скурай ужо былі чарвякі. А калі прыйшлі рускія, занялі нашу хату. Мы спалі ў каморцы. Ды добрыя былі. Цукеркі нам малым давалі, частавалі супам...

— Мне было восем гадоў, як майго бацьку забілі на пачатку вайны ў акопах. Мы засталіся адны. Трэба было памагаць маме пасвіць кароў. Засталося нас трое. Калі кончылася вайна, я была без школы. Тое, чаго навучылася, дык толькі ў царкве.

Абедзве жанчыны згодна дадалі: „Адзначанне гэтага свята — наш чалавечы абавязак".

На Гарадскім могільніку ўбачылі мы між іншым падляшскага дэпутата ад СЛД Яўгена Чыквіна. Паявіліся таксама група з 47 маладых людзей з Калінінграда, якія прыехалі ў Беласток па запрашэнню Брацтва праваслаўнай моладзі. Ксенія і Вольга сказалі коратка: „Мы прыйшлі ўшанаваць загінуўшых за нашу краіну і за ўвесь свет".

Пасля ўрачыстасці на могільніку ветэраны і іншыя запрошаныя госці падаліся на спецыяльных аўтобусах у Генконсульства РБ, дзе ў агародзе быў сарганізаваны пачастунак і канцэрт салістаў Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Алены Фалавай і Уладзіміра Громава.

Апрача беларускага консульства ўдзел у арганізацыі ўрачытасці прынялі Культурны цэнтр Беларусі і Ваяводская ўправа Саюза ветэранаў РП і былых палітвязняў.

Адгалоска з Нарваўшчыны

З вялікай увагай прачытаў я артыкул Аляксея Мароза „У будучыню з беларускасцю" (27 сакавіка 2011 г.) і яго размову з войтам Нарваўскай гміны Андрэем Плясковічам (10 красавіка 2011 г.) — аб планах пабудовы дарог, рамонтах вясковых святліц, рамонтах вуліц у некаторых вёсках. Будуць вось рамантаваны святліцы ў Ласінцы, Крыўцы і Тыневічах, хутка пачнецца рамонт святліцы ў Трасцянцы. Плануецца мадэрнізацыя дарог у вёсках Кавэла, Навіны і кіламетр павятовай дарогі ў Адрынкі і павятовай дарогі ў Пухлы, калі знойдуцца грошы. Пра вёску Бялкі ў гэтым артыкуле не ўспамінаюць ані адным словам, а тут варта прыпоміць, што войт на выбарчым сходзе солтыса ў Бялках абяцаў дакончыць распачаты ў мінулым годзе рамонт быдынка былой малачарні, часткова перароблены на святліцу. Тут неабходна змяніць уваходныя дзверы з бляшаных на драўляныя — яны такія пакрыўленыя, што ўцякае праз іх цяпло з будынка і свабодна лазяць тудою пацукі! Другая, вельмі важная справа, гэта вуліца ў нашай вёсцы — яна найгоршая не толькі ў самой Нарваўскай гміне, але напэўна і ў Гайнаўскім павеце! Тут трэба сказаць шчырую праўду: ужо прапаў адзін план мадэрнізацыі дарогі з Трасцянкі праз Бялкі, Агароднікі, Іванкі-Рагазы да шашы Беласток — Гайнаўка, зроблены яшчэ пры так званай „камуне". Шкада, бо могуць прапасці і другі, і трэці план.

Ад вёскі Трасцянка да вёскі Бялкі на дарозе пакладзена асфальтавае палатно, летась паклалі асфальтавае палатно на гэтай дарозе да вёскі Агароднікі і за вёскай да рачулкі, а далей ані войт Нарваўскай гміны, ані Павятовае праўленне дарог не ўспамінаюць ані словам каб завяршыць рамонт дарогі — каля трох кіламетраў засталося.

Як добра было б зайсці ў Бялках у вясковую святліцу і не саромецца найгоршай вуліцы ў гміне!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Гайнаўская вяртаецца

У чэрвені 1996 года ў Гайнаўцы выйшаў першы нумар мясцовага часопіса „Gazeta Hajnowska". Штомесячнік гэты выдаецца, з невялікімі перапынкамі, па сённяшні дзень. Першы сёлетні нумар перыядычнага выдання „Gazeta Hajnowska" выйшаў ажно напрыканцы красавіка. Новым яе галоўным рэдактарам стаў Аркадзь Панасюк, раней адзін з рэдактараў часопіса „Kurier Hajnowski" і галоўны рэдактар свайго выдання „Pismo Kulturalne". Дарэчы, гэты апошні часопіс зараз з'яўляецца культурным дадаткам да штомесячніка „Gazeta Hajnowska". Штомесячнік будзе цяпер даступны бясплатна.

Напомнім, што выданне „Gazeta Hajnowska" рэдагавалі дагэтуль Янка Целушэцкі (1996-1998), Тадэвуш Тапольскі (1998-2003, 2008-2009), Іаанна Лапінская (2003-2005), Іаланта Захай (2005-2007) і Эмілія Рынкоўская (2010).

Пётр БАЙКО

Нецікавы пачатак (2)

Васіль САКОЎСКІ

(працяг з 19 н-ра)

Падобныя адносіны да ваеннапалонных былі і ў саветаў — ні жывых, ні мёртвых людзей яны ніколі не шанавалі. Не надта дапамагалі і іх ваеннапалонным міжнародныя канвенцыі аб ваеннапалонных. Нялёгка, адным словам, было беларусам служыць у польскай і савецкай арміях і зусім трагічна было быць ваеннапалонным.

А як жылося тым, якім удалося адслужыць свой тэрмін у войску ці адпакутаваць у турмах і вярнуцца дадому? Таксама ненайлепей. Калі хто з польскіх беларусаў згадзіўся стаць каталікам, да таго крыху лепей адносіліся, маглі нават даць нейкую працу, якой тады не ўсім хапала. А хто надалей аставаўся беларусам і праваслаўным, таму горш жылося. Непатрэбныя былі польскім санацыйным уладам праваслаўныя кацапы і нават не скрывалі ад іх гэтага. Іх за абы-што каралі, абкладвалі падаткамі, адбіралі ў іх праваслаўныя храмы...

Не надта вольна дыхалася тутэйшым па паходжанні беларусам, якія апынуліся ў краіне, „где так вольно дышит человек". Як толькі савецкая дзяржава крыху апрывілася ад унутраных і знешніх войнаў і бунтаў, адразу ж пачала вышукваць ворагаў народа і савецкіх парадкаў. На такіх ворагаў рыхтык пачалі пасаваць чэкістам беларусы, якія былі народжаны ў межах тагачаснай Польшчы. Тым больш, калі іх бацькі ці іншая радня вярнулася з бежанства дадому, у Польшчу. Іх арыштоўвалі, саджалі ў сталінскія засценкі, катавалі — і хоць лопні прызнавайся, што ты польскі шпіён. Ой, прыйшлося тады многім беларусам пацярпець. Майму роднаму дзядзьку Васілю таксама. Так што было ў чым выбіраць нашым беларусам. А ўжо ці больш камфортна было сядзець у савецкай „тюряге", ці ў санацыйным „пердлю" — гэта справа густу. „На вкус и цвет — як сцвярджае руская пагаворка — товарищей нет".

У 1939 годзе прыйшлі да нас саветы. Чаканай народам палёгкі зноў не атрымалася. І хто дасюль прыгожа думаў пра савецкія парадкі, на жаль, не меў рацыі або меў яе не да канца. А хто ў савецкі дабрабыт і справядлівасць верыў, той і зусім пашыўся ў дурні. Нашы тутэйшыя беларусы былі ў асноўным сялянамі. Савецкая ж улада сялянства не любіла, а ўжо індывідуальнага сялянства проста ненавідзела. Хутка крыху замажнейшыя сем'і даведаліся, што яны кулакі. Па савецкіх мерках аказалася, што гэтых кулакоў не так ужо і мала ў нас. Пачалі арганізаваць калгасы, а хто не ішоў ахвотна ў іх, таго абкладвалі штораз большымі падаткамі і іншымі павіннасцямі. Пра васьмігадзінны дзень працы селяніну і думаць не прыходзілася. І хаця свае абавязкі перад дзяржавай наш народ выконваў даволі сумленна, пачалі рыхтаваць спіскі тых, каго трэба вывезці на белыя мядзведзі, як у нас казалі. Траплялі ў іх у асноўным добрыя, спакойныя, працавітыя людзі, якіх віной было толькі тое, што былі або крыху замажнейшыя, або мелі больш зямлі, або не падабаліся камусьці з даверaных. Праўда, не ўсіх іх вывезлі, бо не ўспелі да пачатку вайны.

Нашы хлопцы з разбітай у 1939 годзе польскай арміі трапілі або ў нямецкі, або ў савецкі палон, дзе хлябнулі таксама нямала гора. І хоць вялікай рэдкасцю было, што праваслаўны беларус даслужваўся афіцэрскага звання ў польскай арміі, але і некаторым гэтым рэдкім давялося аддаць жыццё і ў Катыні, і ў іншых падобных месцах. Так што паблажкі і літасці да нас, беларусаў, у нашых блізкіх суседзяў не было.

І так было заўсёды: і ў час каралеўскай Польшчы, і ў час царскай Расіі. Адным у галаве было як найхутчэй акаталічыць і апалячыць беларусаў або хоць навязаць нам рэлігійную ўнію. А другім наадварот: сілай ізноў вярнуць беларусаў у праваслаўе дзеля хутчэйшай іх русіфікацыі. А як, скажыце, назваць вымушанае бежанства і змерыць усё гора, прынесенае бежанствам нашаму народу?!.

І апошняя, гадавой даўнасці, калектыўная трагедыя — смаленская авіякатастрофа. Вялікая страта так для ўсёй нашай краіны, як і для нас, беларусаў — у ёй загінуў наш шанаваны архіепіскап Міран. Няхай ужо будзе нарэшце яна апошняй...

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Цацачны спектакль

14 мая г.г. рэдакцыя „Нівы” святкавала 55-годдзе. На такія сустрэчы, як вядома, людзі прыходзяць з кветкамі і добрым словам. Адным з прыгажэйшых падарункаў была „Цацачная крама”. Паставілі яе акцёры са студыі „Гульня ў тэатр” — дзяўчаткі і хлопцы з беластоцкай „чацвёркі”, гімназіі № 7 ды іншых школ. Аднак спектакль, што адразу кідаецца ў вочы, перасякае школьныя шаблоны. Ён пастаўлены ў стылі кабарэ. Як вядома, гэтая форма патрабуе ад гледача кемлівасці і пачуцця гумару. Кожны тэкст, які спяваюць акцёры-зоркі, з падтэкстам. У ім шмат намёкаў на тэму характараў людзей і грамадства. Каб данесці такі пераказ гледачу, акцёр мусіць праявіць адвагу і здольнасці. У Беластоку ўжо трэці раз ставілі „Цацачную краму” (кожны раз у іншым кантэксце і з іншымі песнямі). Навейшая спроба проста чароўная. Праўда, у час юбілею была паказана толькі частка спектаклю (прэм’ера адбудзецца 3 чэрвеня г.г.). Сам праект „Цацачная крама” нарадзіўся ў Мінску, дзякуючы паэту Леаніду Дранько-Майсюку і музыканту Зміцеру Вайцюшкевічу. Песню „Галодны воўк” ведаюць усе маладыя (і маладыя духам) беларусы. Беластоцкі, трэці, спектакль „Цацачнай крамы” паставіла настаўніца Аліна Ваўранюк. Музыку да вершаў напісала Анна Бабік (настаўніца з садка), а аранжыроўку прыдумаў музыкант Павел Васькоўскі (бацька дашкольнікаў з беларускага садка). Варта дадаць, што пяць гадоў таму, калі „Ніва” святкавала 50-годдзе, нашы сябры паказалі сваю першую „Цацачную краму”. Гэты час тэатр прысвяціў свайму развіццю і новым пошукам. Наколькі? Настолькі, што прысутны ў час свята Зміцер Вайцюшкевіч шчыра пахваліў маладых выканаўцаў.

ЗОРКА,
Фота Ганны Кандрацюк

„Трус” Тамаш Мусько

„Качка” Лідка Пякарская



„Котка” Нінка Ваўранюк

„Заяц” Оля Мазурук

Як Аскеладзен перахітрыў троля

(скандынаўская казка)

У старога дрывасека было трох сыноў. Хлопцы не любілі працаваць на лесапавале. Вядома, там дзе лянота, там і бяда пад стрэху лезе. Выправіў аднае раніцы бацька сячы лес найстарэйшага сына. Пайшоў маладзён, стукнуў сякерай аб елку і злякаўся. Перад ім стаяў кашлаты троль.

— Я цябе заб'ю! — сказаў троль. — Я не люблю, калі хто сячэ мае елкі.

— Не-не! — спалохаўся да смерці маладзён. — Я хачу жыць, — і стралой паляцеў дамоў паскардзіцца на пачвару бацьку...

— Ну што тут страшнага? — уздыхнуў стары. — На гэта ён троль, каб палохаць людзей.

На другі дзень выправіў бацька сярэдняга сына ў лес. Той таксама злякаўся троля.

— Давай галаву! — грымнуў лясун. — Я ж гаварыў твайму брату...

Маладзён адразу кінуўся ўцякаць. Калі бацька пачуў яго слязлівы расказ, толькі махнуў рукою. На трэці дзень ён выправіў на лесапавал наймалодшага Аскеладзена. Хлапец навастрыў сякеру, закінуў за плечы мяшочак з ядой і адправіўся ў лес. І зразумела, калі пачаў сячы елку, ён пабачыў кашлачыка.

— Хто табе дазволіў сячы мой лес? — грымнуў троль. — Не магу ўжо няньчыцца з вамі. Заб'ю!..

— Дазволь, пакуль палажу галаву, напіцца вады з каменя, — папрасіўся хлапец.

— Як жа з каменя?

— Нармальна!

Аскеладзен выняў з мяшочка кусок сыру і сціснуў яго так, аж пацякла сы-

роватка. Троль вылупіў вочы. Яшчэ ніколі не бачыў, каб чалавек меў такую сілу, каб выціскаць ваду з каменя.

— Калі будзеш замінаць у рабоце, я цябе сцісну так як гэты камень, — пагразіў кашлатаму маладзён.

— Не, я хачу паглядзець на цябе!

— Тады бяры сякеру і высякай елкі, — загадаў Аскеладзен.

— З прыемнасцю.

Да вечара троль зваліў шмат тоўстых елак. Пасля працы ён прапанаваў хлапцу:

— Пайшлі да мяне на начлег.

— Пайшлі, — згадзіўся Аскеладзен.

Троль жыў у скальной пячоры, дзе стаялі куфры з залатымі манетамі, жэмчугам, дыяментамі і янтарам. Аскеладзен нібыта не прыкмячаў таго багацця.

— Я распалю агонь, а ты ідзі па ваду, — загадаў троль.

Аскеладзен ведаў, што ён не ў змозе падняць жалезныя вёдры кашлачыка. І, каб ратаваць скуру, пайшоў на хітрыкі:

— Як пайду, то прынясу цэлую студню, — прапанаваў хлапец, — што мне насіць ваду тваімі „напарсткамі".

— Не, даражэнькі! — адказаў троль. — Не трэба псаваць калодзежа. Я сам збегаю і прынясу вады. А ты даглядай агонь на кухні.

Як дагаварыліся, так і зрабілі. Пасля наварылі вялікі кацёл кашы.

— А цяпер давай паспаборнічаем, хто з нас больш з'есць, — прапанаваў Аскеладзен.

— Давай!

Трэба вам ведаць, што хлапец навязаў на свой жывот мяшок і, замест у рот, ён туды кідаў кашу. Пасля трох гадзін яды троль здаўся:

— Ну, усё! Наеўся як на Вялікдзень! Каб толькі жывот не лопнуў.

— Ведаю як атрымаць палёгку, — сказаў Аскеладзен.

Хлапец узяў нож, перарэзаў свой „жывот". Пасля ўскочыў на ногі і захадзіў па пячоры. Калі троль убачыў гэты цуд, ён таксама ўзяў нож і перарэзаў свой жывот. І вядома як гэта ўсё скончылася — ён сябе зарэзаў.

А Аскеладзен набраў мяшок золата і дыяментаў ды пайшоў дахаты парадаваць старога бацьку.

ЗОРКА

Музыка з кайфам

„Тройца" ўдвая

Два разы „Тройца" дае дзве „Тройцы" або шэсць, бо якраз шосты альбом прэзентавала ў апошнім часе „Тройца". Лік, аднак, тут не такі ўжо важны, бо кожны альбом гэтага гурту лічыцца падзеяй. У выпадку альбома „Зімачка" можна нават гаварыць пра падвоеную „Тройцу", таму што магіі тут удвая больш, гукаў у два разы больш, а нават сам Іван Кірчук быццам большы, магутнейшы, якога не дагнаць у музычным майстэрстве. Вядома, што „Тройца" гэта тры асобы. Без абодвух Юр'яў — Паўлоўскага і Дзмітрыева — сам Іван Кірчук не здолеў бы стварыць такой прасторы. Рукі ў яго толькі дзве, але гэта ён да нас прамаўляе паміж гукаў, ён інспіруе, адсылае ў космас мінуўшчыны і невядомай яшчэ будучыні.

„Тройца" з гукаў пабудавала манумент. Мы толькі што пазбыліся зімы, а ўжо хочацца вярнуцца ў яе абдымкі. Гэта альбом „Зімачка" нас да таго прымушае. Можа таму, што часам адчуваем сябе нібыта на іншых кантынентах, дзесьці ў гарачай Афрыцы, хаця слухаем беларускай фольк-музыкі. Часам здаецца, што гэта нават не да канца „Тройца", так іншы і так нечакана цікавы свет нам на гэтым альбоме збудавала. А гукаў так шмат, што слухаючы здаецца быццам мы ўвесь час супольна з музыкамі ткалі густое, бліскучае павуцінне. Столькі тут дзеецца.

Абавязкова трэба ўспомніць вакальныя гульні. Выдатна помню, што пры нагодзе альбома „Сон-трава" таксама я ўспамінала пра новыя рысы спеву Івана Кірчука, тады пазбаўленыя характэрнай манеры. Проста быў гэта больш натуральны спеў. На гэты раз Іван Кірчук вырашыў павандраваць на новыя тэрыторыі і разам з яго спевам ляцім высока, высока да неба, падымаемся як гэтыя „янгалы" з апошняга літа „Тройцы". Усё тут ігра-

рае, плыве і заварожвае.

Мушу прызнаць, што цяжка распавядаць пра справы, якія ў пэўным сэнсе незразумелыя. Бо як зразумець геніяльнасць? Можна толькі захапляцца і за гэта мы ўдзячны Кірчуку з сябрамі. Захапляемся ды цешымся, што можам жыць у гэтым месцы ў свеце, да якога гэтыя гукі трапляюць. Эх, жыццё! Не толькі вясна зямлю красуе, а яшчэ і людзі!

i_basovka@o2.pl

(З народнага календара)

Да Міколы не сей грэчкі, не стрыжы авечкі

21 мая, *Івана Багаслова.* У гэты дзень забаранялася працаваць на конях, каб пазбегчы ў будучым няшчасных здарэнняў з імі. У гэты дзень сеялі моркву, агуркі, рэдзьку, цыбулю.

22 мая, *Міколы.* Ад гэтага дня надвор'е лічылася стабільным, без прымаразкаў. Вясновы Мікола лічыўся святам конюхаў. Каб засцерагчы коней ад свавольства ведзьмаў, пастухі абкурвалі коней купальскімі зёлкамі. З Міколавага дня трэба паспяшацца пастрыгчы авечак, пакуль яны не пачалі ліняць. Пра гэта кажа народная прыказка: *Да Міколы не сей грэчкі, не стрыжы авечкі.*

24 мая, *Дзень Кірылы і Мяфодзія.* Па надвор'і меркавалі пра ўсё наступнае лета: калі дзень быў мокры, значыць, лета таксама будзе мокрае, калі сухі — усё лета сухое. Гэты дзень у народзе называлі ***градабоддзем*** і, каб засцерагчыся ад граду, абыходзілі з хрэсным ходам палі і пасевы. На Кірылы і Мяфодзія забаранялася араць.

Польска-беларуская крыжаванка № 21

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 17:

Такс, удод, рэчка, Ікар, госць, палоска, вясёлка, яно, татка, род, тычка, рыс. Дуга, пяты, лёт, іголка, коска, краска, сэрца, яры, карагод.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі **Віялета Дработка, Вікторыя Артэмюк, Дыяна Галёнка, Патрык Сасна, Паўліна Паплаўская, Юліта Данільчук, Наталля Тамчук, Ізабела Плуг** з Бельска-Падляшскага, **Марта Лемеш** з Орлі, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



Беражыце традыцыі

Вялікдзень, па традыцыі, павінен праходзіць весела. Уваскрос Хрыстос, а з ім прырода, вера, надзея і любоў. Аднак у гэтым годзе адна шэрая думка ўсё ж такі закралася ў душу, а менавіта — куды і чаму знікаюць традыцыі? Дзе яны, святочныя традыцыі нашых продкаў, нашых дзядоў і прадзедаў?

Вёска, дзе жывуць мае бабуля і дзядуля, знаходзіцца ў шаснаццаці кіламетрах ад горада Гродна. Называецца яна Абуховічы і налічвае каля 50 дамоў. Жыхары ў пераважнай большасці католікі. Кожнае рэлігійнае свята адзначаю тут — будзь то Дзень памерлых, Ражджаство Хрыстова ці Вялікдзень. На кожнае свята — свае традыцыі. Аднак найбольшае ўражанне на мне заўсёды рабіла тое, што жыхары вёскі да цяперашняга года падтрымлівалі прыгожую пасхальную традыцыю — спяванне велікодных песень у двары кожнага дома. Пасля святочнага стала, калі дзень паволі перацякаў у вечар, невялікія групкі людзей падыходзілі да рыжай хаты, якая заўсёды лічылася цэнтрам вёскі і стартавым пунктам спевакоў. Спачатку проста стаялі, гаманілі, цягнулі час, чакалі, ці не спазняецца хто ды пачыналі спяваць. Найбольш папулярнымі велікоднымі песнямі былі „Zwycięzca śmierci", „Wesoły nam dziś dzień nastał", „Otrzyjcie już łzy płaczący" і „Chrystus zmartwychwstał jest". Пад вокнамі хат, дзе меліся дзяўчыны на выданні, абавязкова гучала „Dobry wieczór, panieneczko". Гаспадары выносілі пачастунак — цукеркі, пячэнне, грушы, пірагі... Найстарэйшыя мужчыны чыталі вершыкі, якія памяталі яшчэ з даўніх часоў. Чыталі на беларускай і польскай мовах. Для іх часам налівалі гарэлкі. Адным словам, забава была надта ж вясёлая і сапраўды святочная.

Астатнія некалькі год традыцыя трымалася ў Абуховічах астатнімі сіламі. Стараліся падтрымліваць яе пераважна карэнныя жыхары вёскі, а таксама іх дзеці і ўнукі. Аднак смерць хутка збірае свае страшныя плёны, а з імі памірае і традыцыя. Ісці спяваць цяпер няма каму і няма куды. Больш чым палова хат пустуе. Маладое пакаленне занадта не імкнецца падтрымліваць абрад дзядоў. Магчыма, не прыязджаюць таму, што на гэтае, здавалася б, найгалоўнейшае хрысціянскае свята няма ў Беларусі афіцыйных выхадных дзён, няма, як кажуць, часу разгуляцца. Таму і выбіраюць манатонны велікодны абед у камфортнай кватэры, замест цягання па вясковых хатах.

Ад знаёмых я чула, што ў некаторых польскіх вёсачках Гродзеншчыны яшчэ захавалася традыцыя спявання пад вокнамі. Маю надзею, што жыхары такіх месцаў пранясуць яе праз жыццё і перададуць сваім нашчадкам, таму што жыць без такіх унікальных традыцый сапраўды сумна.

Гражына ЛУШЧЫК

ЗАПРАШЭННЕ

Дыскусійны клуб „**АБ-БЫ**"
Пагаворым пра
паэта Анатоля Сыса ў 6-ую гадавіну смерці

У праграме прэзентацыя фільма **Міколы Ваўранюка „Сыс пра Сыса"** а таксама сустрэча з **Мірай Лукшай** і **Ганнай Кандрацюк-Свярубскай** — журналісткамі тыднёвіка „Ніва"

20.05.2011, 18:00

Пачатковая школа № 4, вул. Чэнстахоўская, 6а, Беласток

Projekt realizowany dzięki dotacji Marszałka Województwa Podlaskiego

Тры новыя кнігі трох аўтараў трох пакаленняў былі прэзентаваны падчас семінара Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа", які прайшоў у Беластоцкім універсітэце 7 мая. Усе кнігі выйшлі ў Бібліятэцы літаратурнага аб'яднання „Белавежа", дзякуючы падтрымцы Культурнага цэнтра Беларусі пры пасольстве РБ, які дзейнічае ў Беластоку.

Кнігі трох пакаленняў

Міра ЛУКША

Старшыня „Белавежы" прафесар Ян Чыквін прадставіў новыя кнігі і іх аўтараў, асоб кожнай рознай па ўзросце на чвэрць стагоддзя:

— У „Жураўлінай журбе" Лідзіі Маліноўскай (46 год, у дзявоцтве Мойсік, родам з Дубяжына) маем дачыненне з вельмі цікавым кніжным дэбютам у жанры лірычнай мініяцюры (удзельніца конкурсу „Дэбют" тры гады таму). „Выбранае" — да 70-годдзя (7 верасня) Уладзіміра Гайдука. І Кацярына Сянкевіч — кніга пад вельмі паэтычнаю назвай „Дачка ружы". Кацярына Сянкевіч (родам з Нарвы) — самая маладая ўдзельніца семінара і літаб'яднання (20 гадоў). Кася — сёлетняя выпускніца Супрасльскага мастацкага ліцэя, месяц таму абараніла дыплом па жывапісе. На вокладцы кнігі — нацюрморт яе аўтарства, у кнізе — два яе аўтапартрэты. Кацярына два гады таму прымала ўдзел у Агульнапольскім конкурсе беларускай паэзіі і прозы „Дэбют", арганізаваным Беларускім саюзам і „Нівай".

— Кніга „Полымя роднае" юбілейная і значная, — прастаўляў Ян Чыквін кнігу свайго аднакласніка з Бельскага белліцэя Валодзі Гайдука. — Ён жыве ў Полымі сваім, хутары Тарнопаля Нараўчанскай гміны, у прамым сэнсе і пераносным. На хутары ён адзін, гаспадарка не можа яго выкарміць, атрымлівае марныя 300-400 злотых пенсіі і за гэта трэба выжыць. А прытым ён чалавек незвычайна таленавіты. Тое, што ён напісаў, патрабуе дакладнага аналізу, інтэрпрэтацыі. Гэта не фальклорная творчасць, падобная на творчасць нашых першапачаткоўцаў. Гэта вельмі прафесійная паэзія. Пры ўсім тым паэзія выпакутаваная. І зноў ажыла выпакутаваная сваім лёсам, сваёй біяграфіяй, прытым нідзе няма там нянавісці — ні да лёсу, ні да людзей, ні да Бога. Паэт не жаніўся, застаўся адзін, і ў яго ёсць вельмі светлыя вершы пра каханне. Як гэта стаецца? Стаім перад нейкай сапраўднай таямніцай творчасці. Вельмі прыгожыя ўспаміны пра жанчын, пра дзяўчат, пра маці, пра прыроду, нейкія ўваходжанні ў метафізіку, адкрываюцца нейкія незвычайна прыгожыя культуровыя гарызонты, якія сведчаць пра тое, што ён чалавек начытаны. Вельмі цікавая атрымалася кніга. Я вельмі рады, што давялося мне быць рэдактарам гэтай кнігі. Зборнік складаецца з вершаў, якія выйшлі ў ранейшых зборніках („Ракіта", „Блакітны вырай", „Пах аернага хлеба"), а таксама з вершаў недрукаваных у зборніках, вельмі прыгожых.

— У выпадку зборніка „Жураўліная журба" Лідзіі Маліноўскай маем дачыненне з вельмі цікавым дэбютам. Прычым гэтыя лірычныя мініяцюры выплываюць з глыбокага асабістага, перажытага вопыту. Гэта не кніжныя сітуацыі, не культуровая нейкая падаплёка тэкстаў, усе яны грунтуюцца на асабістых перажываннях. Усе яны маюць такую багдановічаўскую пераходнасць ад аптымізму да песімізму, ад мажору да мінору. Гэта вельмі цікавае спалучэнне ў адным тэксце гэтых двух пачуццёвых настрояў, калі твор пачынаецца радасна, з шырокім ахопам прыродных з'яў, каб апусціцца ў нейкі, часам ледзь адчувальны, песімізм, даткнуць нейкай трывожнай струны, якая загучыць, па-за тэкстам. Зборнік невялічкі па аб'ёме, складаецца з трох частак — „Балючыя радасці", „Светлае пакаянне" і „Люстраныя калідоры". Варта дадаць, што кніжка графічна афармлена аўтаркай пры дапамозе ўласнай графікі і фларыстыкі.

Фота Міры ЛУКШЫ

Галіна Твярановіч: — Трэба падкрэсліць, што гэта сапраўды артэфакт, твор мастацтва, са здымкам дарогі пасля дажджу (дачкі Марты), з графікай, якая расквеціла гэтую кнігу. Атрымаўся такі індывідуальны і прыгожы зборнік лірычнай прозы. Што „нярадасная"? — Жыццёвая. А ўсё жыццё пераліваецца як у сонцы. Кнігі сапраўды трох пакаленняў па ўзросце.

racyja.com

— І ў выпадку Кацярыны Сянкевіч паўтараецца сітуацыя з Яшам Буршам, мастаком, адным з першых „белавежцаў", — Ян Чыквін быў пры пачатках „Белавежы", такі ж малады. — Яша Бурш (Ян Анісэровіч) выдаў адзін зборнік „Праменні думак", шкада, што пасля паглыбіўся толькі ў жывапіс, у мастацтва. У зборніку „Дачка ружы" яшчэ далей можна бачыць нейкія паралелі і сувязі, таму што і ў Яшы Бурша, і ў гэтай наймалодшай нашай сённяшняй аўтаркі ёсць нейкая сходнасць, радство душ. Магчыма, што якраз і Яша, і Кася, думаюць і бачаць нейкімі вобразамі, характэрнымі для жывапісу. І гэтая паэзія, як і ў выпадку Яшы Бурша, не ў кепскім, а ў добрым сэнсе — эгаістычная. Яна сканцэнтраваная на сваім, вельмі глыбокім успрыманні. І ўсюды прабіваецца гэтае „я". Бо ёсць тэксты і ў Валодзі Гайдука, і Лідзіі Маліноўскай, дзе „я" і прысутнічае, але гэтае „я" адносіцца да любога чытача. А тут „я" вельмі выразна падкрэсленае: „Гэта мяне датычыць, гэта я ў гэтым узросце". Вершы вельмі кароткія, яны ў двух ці трох выпадках абмяжоўваюцца да двух радкоў, гэта нейкая максімальная спроба сінтэзаваць усё ў адной метафары ці выказаць ладунак у вельмі згушчанай слоўнай масе. *Я малілася да травы.// Вуха травы слухае... „Драбіна": Найбольш бяспечна забыцца аб табе —/ жывеш завысока.// Спрабую ўзняцца туды —/ лепш каб ты не бачыў мяне на драбіне/ думак.// Уздымаюся нашай агульнай/ драбінай, / бо адпаведны напрамак вядзе ўгору,/ хоць неакрэслены ні знізу, ні зверху...* Такія асацыяцыі, такія згушчаныя метафары. Такая нейкая экзістэнцыяльная сітуацыя, сказаная на маю думку вельмі цікава, трапна, адкрыўча, тая драбіна, на якой стаіць упісаная ў культуровую сітуацыю ці структуру свету, і ў хрысціянскую, драбіна, па якой чалавек карабкаецца, прычым напрамак вядзе ўгору, хоць неакрэслены ні знізу, ні зверху. Чалавеку застаецца кантаўскі выбар.... Тут варта ўспоміць пра афармленне і гэтай кнігі.

— Гэтая вокладка якраз сведчыць пра здольнасці, пра індывідуальнасці, пра асабовасць аўтаркі, і варта сказаць пра яе мастацтва, — дадала Галіна Твярановіч. — Назва „Дачка ружы" таксама дакладная як для дваццацігадовай дзяўчыны: *Дзе хаваеш сэрца.?/ Дзе хаваеш імглу?/ (не пытаюся)/ Я — дачка ружы./ Паколеш сабе пальцы.* Гэта адпавядае і таму прыгожаму ўзросту, у той час гаворыць і пра характар, і пра глыбіню, і пра патэнцыял укладзены, і, можна спадзявацца, што далей і далей будзе эвалюцыянаваць яе творчасць. Адчуваецца таксама і ўплыў польскай літаратуры.

— Ці ўключаць польскамоўную беларускую літаратуру ў беларускі кантэкст? — прагучала пытанне. Аксана Данільчык, пасля сустрэч у Беларусі з Ігнатам Карповічам і Міхасём Андрасюком вырашыла: так, паколькі мова польская, а патрыятызм у іх беларускі.

— Падобна і з Яўгенам Кабацам, якога род з-пад Нараўкі, — заўважыў Георгій Валкавыцкі, заснавальнік „Белавежы". — Жэнікам, як яго называў Яраслаў Івашкевіч.

Прэзентацыі папярэдзілі выступы мінскіх аўтарак: рэдактара часопісаў „Наша вера" і „Ave Maria" Хрысціны Лялько ды паэткі і перакладчыцы Аксаны Данільчык. Госці пазнаёмілі прысутных са сваёй творчасцю і далі пачатак дыскусіі аб сітуацыі ў сучаснай беларускай літаратуры. Выступіў таксама галоўны рэдактар тыднёвіка беларусаў у Польшчы „Ніва" і дырэктар Радыё Рацыя Яўген Вапа, які з'яўляецца таксама сябрам БЛА. Распавёў ён пра ініцыятыву стварэння ў Польшчы інстытутаў для нацыянальных меншасцей, кіраваных МУСіА. Стварэнне інстытутаў пакуль адкладзена.

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Вандроўка ў мінулае і... цяперашняе

Здавалася мне, што ў Чаромсе ўжо камунікацыйны край свету, што адсюль няма ўжо з Беластока ніякіх спалучэнняў для далейшага падарожжа. Але там нечаканы сюрпрыз: можна перасесціся і ў цягнік у Тлушч, і ў цягнік у Высока-Літоўск. Але гэтая роскаш паказваецца мне быццам аркестр на „Тытаніку", бо ж зусім нядаўна чытаў я інфармацыю пра мадэрнізацыю чыгуначнай лініі з Беластока ў Варшаву, якая прадбачана за некалькі гадоў, і пра поўную адсутнасць планаў мадэрнізацыі чыгункі з таго ж Беластока ў Чаромху, хаця рэйкі на гэтым адрэзку ледзь-ледзь ужо трымаюцца. Яшчэ крыху і гэтая лінія кане ў Лету...

З Чаромхі падаюся ў напрамку Ставішчаў, якія ў сапраўднасці з'яўляюцца вонкавай вуліцай важнага ў мінулым чыгуначнага цэнтра. Наганяе мяне рэйкабусік у Высока-Літоўск, у якім, здаецца мне, пасажыраў не больш, чым магла б памесціць дрызіна. Ну, але міжнародная камунікацыя мусіць адбывацца з фасонам... У Ставішчах тры крыжы ў пачатку вёскі, недалёка за імі два чарговыя крыжы на абочыне вуліцы. На супрацьлеглым панадворку заўважаю гаспадыню з гаспадаром, вітаюць мяне таксама два баявітыя сабачкі. Калісь былі мнагадзетныя сем'і, пры якіх трымалася і разнавідная жывёла — сёння адны і другія суб'екты моцна ў нашым грамадстве згарнуліся... Сабачкі па загадзе гаспадароў дазваляюць мне зайсці на панадворак.

Адзін са згаданых крыжоў, бетонны, стаіць там з незапамятнага гаспадарам часу, нядаўна яго адрамантавалі і ў ходзе гэтага рамонту замазалі надпісы на ім. Другі крыж, з жалезных трубак, некалькі гадоў таму перанесла сюды адна з мясцовых жыхарак з могілак, калі на магіле сваіх сямейнікаў паставіла больш мадэрны помнік. Могілкі, дзе жыхары Ставішчаў хаваюць сваіх пакойнікаў, у двух кіламетрах ад вёскі, за шашой, што на пагранпераход у Полаўцы; заклалі іх у пачатку 1950-х гадоў, а ў пачатку 1960-х пабудавалі там царкоўку. Ставішчы, хаця прымыкаюць да Чаромхі, належаць да Зубачоўскага прыхода.

Пытаю таксама пра царкву ў Полаўцах, бо ж калісь, як згадваюць захаваныя пісьмовыя гістарычныя помнікі, была ў Полаўцах царква. Даведваюся, што царкоўка там ёсць, пры самай граніцы, зараз за офісам пагранпераходу і, магчыма, што пагранічнікі не дазволяць нават да яе выйсці. На пытанне, ці адпраўляюцца там богаслужэнні, чую адказ, што будзе такое неўзабаве, 21 мая, на Івана — тады пагранічнікі прапускаюць туды верных.

Падаюся далей ставішчанскай вуліцай, на якой больш-менш да паловы асфальт не надта роўны, але далей — як стол. На вулічнай лавачцы прысела тройка пажылых вяскоўцаў. Калі набліжаюся да іх, запрашаюць сфатаграфаваць зваленыя вакол былога пункту прыёму малака новыя бардзюры, якія там ляжаць ад двух гадоў. І скардзяцца, што новы войт нічога не робіць. Перад выбарамі абяцаў многа, але дагэтуль нічога не робіцца — у параўнанні з ранейшым войтам цяперашні гэта *пёнэк*.

Але не на ўсё наракаюць вяскоўцы. Вось вуліца з новым асфальтавым палатном, якое маюць дзякуючы пані Мішчук, што жыве каля чаромхаўскай насычальні і якая ў гайнаўскім старостве загадвае дарогамі. Пытаю і пра будынак святліцы, які свежа адрамантаваны звонку, але ўсярэдзіне яго старыя сталы. Маюць быць і новыя сталы — з нейкай былой школы, толькі невядома маім суразмоўцам, з якой...

Дарога са Ставішчаў у Полаўцы — вузкая жвіроўка, якая паступова абрастае маладым лесам. Сама вёска Полаўцы больш нагадвае леснічоўку чым вёску — хат там што кот наплакаў, не відаць там ніякага руху, на адным з панадворкаў дзве машыны з кракаўскай рэгістрацыяй. Пасярэдзіне вёсачкі ў драўлянай агароджы два праваслаўныя крыжы: драўляны і з металічных трубак. І дарога з Полаўцаў у напрамку пагранпераходу — таксама вузкая жвіроўка, якая абрастае маладым лесам.

Міжнародны поезд з Чаромхі ў Высока-Літоўск

Заходжу на пагранпераход, на кантрольны пункт. Дзяжурны выклікае старэйшага рангам службоўца, пасля якога з'яўляецца яшчэ важнейшы рангам, забіраюць у мяне дакументы і падаюцца выканаць неабходныя працэдуры. А я за той час гутару з дзяжурным, мясцовым маладым чалавекам, з Чаромхі. Цікаўлюся, грамадзяне якой краіны — Польшчы ці Беларусі — больш перасякаюць мяжу; з гэтым бывае па-рознаму: раз адны, раз другія, нейкага прынцыпу тут няма. Няма таксама іншага прынцыпу: на маё пытанне, ці граніцу можна перасячы пешаходу, не атрымліваю рашучага адказу. Рух тут, дарэчы, невялікі і сітуацыя з майго пытання, відаць, тут яшчэ не здарылася. Насупраць кантрольнага пункту няспешна будуецца тэрмінал, можа будзе жвавей калі ён стане.

Царкоўка пры пагранпераходзе ў Полаўцах

Пагранічнікі дазваляюць мне зайсці да царкоўкі. Невялічкая яна, пабудаваная мабыць не надта даўно, на невялікіх вясковых могілках, на якіх каля дваццаці магіл пасляваеннага перыяду; значыць і царкоўка пасляваенная. На тапаграфічнай карце пазначаны нейкія могілкі з беларускага боку і магчыма што там і была раней гістарычная палавецкая царква. Але калі пралягла там савецкая мяжа, саветы, мабыць, палічылі, што там „музей атэізму" непатрэбны... Але гэта толькі мая здагадка.

У старых дакументах пра палавецкую царкву чытаем: „Въ с. Половцахъ, Брест. у., церковъ существовала до уніи. 1578 г. 1 іюня канцлеръ в. к. л. Остафій Воловичъ, бывший тогда старостой Берестейскимъ и Кобринскимъ, далъ листъ на имя своего Милейчицкаго наместника, чтобы тотъ обезопасилъ местнаго священника Половецкаго отъ притязаний «въ застенкахъ и городахъ» отъ некоего Марка. Въ Половцахъ при означенной Михайловской церкви былъ священникомъ въ данную пору Иванъ Парфеновичъ. Изъ упомянутого выше листа видно, что священникъ неоднократно жаловался на обиды со стороны названного Марка Федоровича. Въ результате было то, что канцлеръ высылалъ каноника виленскаго ксендза Яна Суходольскаго для проверки на месте этой жалобы. Кс. каноникъ выезжалъ, нашелъ, что церковь действительно терпитъ обиду отъ названного Марка Федоровича".

Іван Парфяновіч быў актыўным святаром, пра што сведчыць і наступная вытрымка з каралеўскай прывілегіі: «Жикгимонтъ Третій, Божою милостью, король Польскій, великий князь Литовскій, Рускій, Прускій, Мазовецкій, Инфлянскій и королевства Шведзкого найближшій дедичъ и пришлый король. Ознаймуемъ симъ нашимъ листомъ. Билъ намъ чоломъ богомолецъ нашъ священникъ церкви заложенья Светого Михаила въ старостве Берестейскомъ, въ селе Половцахъ, Иванъ Перфиновичъ, и поведелъ перед нами, ижъ дей вже отъ немалого часу, отъ колькональцати летъ маетъ онъ тую церковъ (...) и просилъ насъ, абыхмо его при той Церкви и земляхъ, до нее належачихъ, до живота его заховали и листомъ нашимъ то ему утвердили. А такъ мы, з ласки нашое господарское, на чоломбитье его чинечи а заховуючи его во всемъ водле тыхъ листовъ, перед нами покладаныхъ, тую церковь и две волоки земли зо всимъ на все, яко то и до сего часу мелъ, при немъ есмо оставили, и то ему симъ листомъ нашимъ до живота его утвержаемъ. Маетъ помененый Иванъ Парфеновичъ оную церковъ Светого Михаила въ селе Половцахъ зъ двема волоками, застинками и огородами, до ней належачими, держати, всякихъ пожитковъ, оттоль приходячихъ, на себе уживати до живота своего, не будучи повиненъ с того нам господару, ани на урадъ Берестейскій ничого давати и ніякой повинности полнити, только службу Божую въ оной церкви служити, а за насъ господаря пана Бога просити; а того пильне постерегати, якобы се въ той церкви хвала Божая завжды пристойне, ведле закону Рускаго, одправовала и наука добрая чинена была, звлаща для людей простыхъ...». Гэтая прывілея, ад 11 чэрвеня 1589 года, у агульнасці вытрывала з таго часу бурныя рэлігійныя водавароты ды дзейнічае, як мне здаецца, і па сённяшні дзень, хаця ў моцна абмежаванай прасторы.

(працяг будзе)

(Не)шчаслівая трынаццатка (9)

Анатоль ПАРЭМБСКІ

Вярнуўшыся з турмы, Ванька не паказваўся нідзе, хоць усе ведалі, што ён ужо дома. Прыехаў жандар Бобэр са сваімі кампаньёнамі, але палякаў-жандараў не было ні аднаго. Бобэр пацвердзіў, што з палякаў-жандараў і фальксдойчаў фармуецца мілітарная часць, якая будзе пастаўлена на фронт, каб бараніць Варшаву перад савецкімі войскамі:

— Рускія далей як да Віслы не дойдуць, бо немцы кінуць на фронт „цудоўную зброю" і тады канец вайны прыйдзе ўжо хутка. Будзе тут нямецкі край, а беларусам нават пазволім мець свае беларускія школы. Для жыдоў і палякаў месца тут не будзе! — і Бобэр папракнуў Ваньку, што той не хоча арганізоўваць гуртка „Самааховы".

У далейшай размове Бобэр цешыўся: „Калі цябе, Ванька, гестапа выпусціла са сваіх рук, то значыць, што нас, жандараў, ацэньваюць добра!" і параіў Ваньку, каб служыў немцам верна, бо і па заканчэнні вайны думае ён быць тут уладаром.

Фота Міры ЛУКШЫ

Не меней рады вяртанню Ванькі з турмы быў і Фарба. Казаў: „Цяпер я перакананы, што правільна паступіў, калі прыняў на працу Ніну да дання кароў. Яна тут прыдалася болей, чым каля Кёнігсберга". Фарба таксама, як Бобэр, збіраўся пасля вайны гаспадарыць на Беласточчыне.

Праз пару дзён пасля выхаду Ванькі з турмы нямецкі афіцэр, што пісаў Ваньку ліст начальніку турмы праз пасрэдніцтва Нічыпара Карпюка, паведаміў Ваньку, што прыедзе да яго ў госці чыноўнік, з якім Ванька быў дамоўлены. Чаго той чыноўнік прыедзе, Ванька добра ведаў і быў падрыхтаваны да спаткання. У вызначаны час спадзяваны чыноўнік прыехаў у суправаджэнні жандараў. Размова паміж імі была даволі доўгая. З яе Ванька даведаўся хто на яго даносіў у гестапа, а не ў жандармерыю. Размова адбывалася на польскай мове. Пасля вайны, здаецца ў 1946 ці 1947 годзе, той чыноўнік прыслаў Ваньку ліст, напісаны ў Кракаве.

Ужо ў чэрвені 1944 г. паявіліся войскі Вермахта. Капалі акопы над рэчкай Свіслач для абароны ад Савецкай Арміі. Капаць тыя равы, а было іх тры ды з узмоцненымі пунктамі для камандавання, назвозілі шмат цывільных, а таксама гналі да работы мясцовых жыхароў. Чатырыста метраў ад Ванькавай хаты на полі ў даліне нямецкае войска пасадзіла лес са зрэзанях 20-30-гадовых елак і там паставілі гарматы, з якіх стралялі па лясах, пэўна каб напалохаць партызан, а таксама і за рэчку Свіслач, адкуль спадзяваліся савецкага войска. Камандзір гэтых гармат, нямецкі капітан, кожны вечар прыходзіў да Ванькі быццам бы папіць малака. Умеў ён крыху гаварыць па-руску, а Ванька крыху па-нямецку, і так нямецкі капітан Вермахта адважыўся сказаць, што застаўся б тут, калі яго часць адступіць, калі б Ванька гарантаваў, што рускія яго не заб'юць. Вядома, такой гарантыі ніхто не мог яму даць.

18 ліпеня 1944 г. нямецкі капітан прыйшоў да Ванькі апошні раз. Развіталіся. Ванька пажадаў немцу жывым і здаровым вярнуцца дахаты. Капітан абяцаў, што пасля вайны напіша Ваньку ліст. Не напісаў. 18 ліпеня 1944 г. а 22 гадзіне адышоў з Вырэмбаў апошні немец. Раніцай, у 6 гадзін, савецкія войскі перайшлі рэчку Свіслач і акопы без аднаго выстралу. Радасці насельніцтва не апішаш!

У 1946 г. у Беластоку судзілі двух нямецкіх жандараў, палякаў па нацыянальнасці, Я. Ч. і Ф. Ш., якіх арыштавалі ў Лодзі. Ванька быў сведкам абароны. Абодвух жандараў суд апраўдаў — палічыў іх нявіннымі.

(працяг будзе)

http://mahilyowspring.org

Ціск на грамадскую супольнасць у Беларусі пасля сумнавядомых падзей мінулай зімы не аслабляецца. Па-ранейшаму лукашэнкаўскія памагатыя кідаюць за краты палітыкаў, праваабаронцаў, журналістаў, вядзецца беспрэцэдэнтны ў краіне палітычны судовы працэс над экс-кандыдатамі ў прэзідэнты. Здаецца, правячы рэжым ужо даўно мусіў вынішчыць нават жаданне мець адрозную ад афіцыйнай думку, але не ўсё так проста — дабро, як, дарэчы, і зло, канчаткова перамагчы нельга. Таму ўзнікаюць і дагэтуль не знікаюць назаўсёды апазіцыйныя і праваабарончыя суполкі.

Адным з прыкладаў такой неўміручасці можна назваць праваабарончы цэнтр „Вясна", які ўжо стаў добравядомы кожнаму, хто так ці інакш спрабаваў абараніць свае палітычныя правы. Але, акрамя цэнтральнай сядзібы ў Мінску, падобныя арганізацыі павінны мець нейкае тэрытарыяльнае разгалінаванне. У „Вясны" адным з мясцовых прадстаўніцтваў з'яўляецца суполка ў Магілёве. Больш падрабязна даведацца пра яе стала магчыма дзякуючы сайту, што ў маі з'явіўся ў сусветным павуцінні.

Месціцца сайт па адрасе **http://mahilyowspring.org.** Выгляд яго на першы погляд не надта прыцягальны — шэра-белае выяўленне неяк не натхняе на барацьбу за свае правы. Здаецца, распрацоўшчыкі не паклапаціліся аб аптымістычным колеравым фоне, думаючы больш пра сур'ёзнасць і строгасць выяўлення.

Што ж тычыцца будовы сайта, то тут яна не надта адрозніваецца ад традыцыйных варыянтаў. Сайт падзяляецца на тры часткі. Пасярэдзіне — стужка навінных паведамленняў. Навіны на галоўнай старонцы маюць толькі анонсы. Каб прачытаць тэкст цалкам, трэба клікнуць на загаловак ці першыя радкі нататкі.

Тое, што перш за ўсё кідаецца ў вочы на левым баку сайта — гэта каляндар, які з'яўляецца архівам. На падкрэсленых чыслах месяца мы можам пазнаёміцца з навінамі, што адбыліся ў тыя дні. Дарэчы, тут жа прадугледжана яшчэ выйсце да відэаінфармацыі, але яе пакуль няма.

На правым баку галоўнай старонкі месцяцца банэры і выйсці да інфармацыі аб розных акцыях „Вясны", pdf-версіі друкаваных праваабарончых выданняў „Права на волю" і „Праваабарончы веснік".

Усе іншыя выйсці да рубрык сайта знаходзяцца ўверсе выяўлення. Іх цяперашнім часам не так многа — усяго толькі шэсць, прычым далёка не ўсе пакуль насычаныя якой-кольвечы інфармацыяй. Перш за ўсё гэта тычыцца старонкі „Пра нас" — яна практычна пустая, хоць, падаецца, мусіць быць запоўненая ў першую чаргу. Усё ж такі, менавіта па тым, як пазіцыянуе сябе арганізацыя, складаецца ў віртуальных наведвальнікаў першаснае ўражанне аб ёй і яе дзейнасці.

Рубрыка „Ацэнкі", якая ідзе другой у цэлым пераліку, пакуль таксама не месціць аніякай інфармацыі. Папраўдзе, пакуль увогуле незразумелая мэта яе існавання.

З усіх рубрык, якія існуюць на сайце, найбольш вартыя ўвагі „Падзеі" і „Бібліятэка". Калі першая, па сутнасці, з'яўляецца дубляваннем галоўнай старонкі, то другая месціць ужо вышэйзгаданыя праваабарончыя перыядычныя выданні. Таксама ў планах размяшчэнне на ёй аглядаў, кніг, узораў дакументаў і міжнародных дамоўленасцей па правах чалавека.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ к а р б ы

Базыльянскія муры ў Вільні

У Вільні багата беларускіх адрасоў і знакаў. Каб толькі абысці іх усе, спатрэбіцца некалькі дзён. У кожнага з беларусаў, якія закаханыя ў нашу старадаўнюю сталіцу, ёсць свае ўлюбёныя куточкі — багацейшая культурна-помнікавая спадчына дае такі выбар. Асабіста я заўсёды іду ў Базыльянскія муры — цэлы архітэктурны ансамбль, які ўлучае старадаўні храм і комплекс дзіўным чынам звязаных паміж сабой будынкаў. Там асаблівая атмасфера і незвычайная аўра. Апошні раз я прастаяў там паўгадзіны амаль у поўнай цішыні, якую не парушыў аніводны чалавек ці аўтамабіль — і гэта фактычна ў самым цэнтры старога горада.

У комплексе царквы і манастыра Святой Тройцы пераплялася, здаецца, гісторыя ўсёй Вільні як сталіцы Вялікага Княства Літоўскага. Пра пачаткі горада сведчыць невыразны тэкст на сцяне велізарнай царквы ў двары, які можна зразумець наступным чынам: „На месцы гэтага храма, у быўшай тут калісьці дуброве, у палове XIV ст. прынялі пакутніцкую смерць за Праваслаўную Хрысціянскую веру святыя пакутнікі Літоўскія, Віленскія Цудатворцы — Антон, Іаан і Яўстафій". Гэты надпіс быў выбіты не раней дзевятнаццатага стагоддзя. Над табліцай у нішы змешчана і моцна пашкоджаная фрэска з выяваю трох святых. Падобная бляклая фрэска і ў нішы з іншага боку. На той жа сцяне, дзе ўваходныя дзверы — мемарыяльная табліца ў памяць пакутніка іншай канфесіі — уніяцкага святога Язафата Кунцэвіча.

Гісторыя святыні пачалася ў XIV стагоддзі, калі на месцы гібелі трох мучанікаў другая жонка князя Альгерда, Юльяна, пабудавала драўляныя царкву і манастыр. А ў пачатку XVI стагоддзя высілкамі князя Канстанціна Астрожскага паўстаў ужо мураваны шэдэўр дойлідства. Паводле падання, якое дайшло да нас дзякуючы этнографу Адаму Кіркору, тут захоўваўся каштоўнейшы абраз Маці Божай Праведніцы, які стварыў сам евангеліст Лука. Пазней храм стаў уласнасцю ўніятаў, тады ж комплекс прыдбаў назву Базыльянскія муры. Калі ж прыйшлі расейцы, яны прыстасавалі будынкі манастыра пад астрог. Тут сядзелі зняволеныя філаматы і філарэты. Тут Адам Міцкевіч напісаў сваю знакамітую паэму „Дзяды", пра што сведчыць адмысловая шыльда на сцяне кляштара.

У наш час у храма не засталося гаспадара, яго перадалі... украінскай грэка-каталіцкай суполцы. Відаць, гэты абсурд (украінцаў як арганізаванай супольнасці ніколі не было ў Вільні!) стаўся магчымым толькі таму, што на царкву ніхто іншы не заявіў прэтэнзій. Ці праходзяць зараз тут набажэнствы — сказаць цяжка, прынамсі расклад літургій не вісіць. Сам храм знаходзіцца не ў найлепшым стане. Праўда, за апошнія гады тэрыторыю вакол яго ўпарадкавалі і выклалі пліткай, на адной са сцен з'явіліся рыштаванні — магчыма гэта азначае пачатак рэстаўрацыі. Найбольш пашкоджанай з'яўляецца вялікая званіца (аналагаў ёй няма напэўна), якая стаіць асобна.

Каб увайсці ў двор базыльянскіх муроў, трэба прайсці дзве „глыбокія" барочныя брамы. Ужо на самым уваходзе злева вісіць шыльда ў гонар Ігната Дамейкі, нацыянальнага героя Чылі, ураджэнца Гарадзеншчыны, якім ганарацца і беларусы, і палякі. У будынку былога кляштара доўгі час былі розныя беларускія навучальныя ўстановы. У наш час пашчасціла быць на адкрыцці мемарыяльных дошак у гонар Наталлі Арсенневай, якая тут вучылася, і Максіма Гарэцкага, які тут выкладаў. А зусім нядаўна аналагічным чынам быў ушанаваны вялікі хрысціянін і беларус ксёндз Адам Станкевіч. Аднак, час існавання тут беларускай гімназіі і іншых беларускіх устаноў — асобная гісторыя.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Бельскія сустрэчы

Стэфан Лукашук

Бельск пакідаў я пасля адзінаццатай. Каб заехаць у Райкі да Валіка Семенюка, трэба было адолець пяць-шэсць кіламетраў. Меркаваў, што на падарожжа спатрэбіцца каля гадзіны часу. Да адпраўкі цягніка заставалася больш трох гадзін. Зрадзілася затым ідэя, каб пры нагодзе праведаць Стэфана Лукашука, дваюраднага жончынага брата. Жыве ён па дарозе ў Леўкі. Ад шпіталя не больш чым кіламетр будзе...

Невялічкая драўняная хатка. Знаёмы панадворак. Тут дажывалі старасці дзядзька Міхал з цёткай Нінай, перасяленцы з Краснага Сяла. Цётка Ніна была сястрою маёй цешчы Ганулі з Дубяжына, хрышчонай маці маёй жонкі. Як блізкія суродзічы спатыкаліся мы пры застоллі ў час царкоўных фэстаў. У Дубяжыне адзначалі Льяша (2 жніўня), а ў Бельску гасцявалі на Прачысту (21 верасня).

Дзядзька лічыўся вядомым гаспадаром і набожным чалавекам. У царкву з цёткай ездзілі кожную нядзелю (у Вульцы-Выгаеўскай быў іхні прыход). У Красным Сяле нарадзілася ім двое дзетак: хлопчык Грыша і дачка Ліда. Гжэсё, як бацькі яго клікалі, будучы падросткам разбіраў снарад. Няшчаснага на кавалкі разнясло. Бацькі моцна перажывалі трагедыю. Пасля трое дзетак яшчэ нарадзілася, але ўсе памерлі. Мясцовыя варажэйкі параілі цётцы пакінуць свой дом і перасяліцца ў іншае месца. Мела гэта паўплываць на змену лёсу.

Купіў дзядзька ад бяльшчаніна больш сямі гектараў поля. Вызначылі пляцоўку пад забудову. Дом збудавалі на акраіне горада. І так на калёніі пачалі новае жыццё. Васьмігектарную гаспадарку ў Красным Сяле пакінулі дачцэ.

У Бельску нарадзіліся ім тры сыны: Міхал, Стэфан і Антось. Усе шчасліва выраслі. Старэйшы Міхал закончыў белліцей і пачаў пашыраць веды аб машынах і сельскагаспадарчых установах у вышэйшай навучальнай установе ў Беластоку. Там жа атрымаў дыплом магістра і ўладкаваўся на працу. Стэфан закончыў Тэхнікум водных меліярацый у Супраслі, а самы малодшы Антось афарміўся на працу ў Бельскім элеватары шафёрам-механікам. З ходам часу дзядзька з цёткай адышлі ў краіну вечнасці. Сыны пажаніліся. Кожны пайшоў сваім шляхам. Міхал ужо на пенсіі, з сям'ёю абсталяваўся ў Беластоку. Антось надалей працуе на элеватары, жыве ў Боцьках і разам з жонкай займаецца жывёлагадоўляй (іхні статак лічыць каля сарака штук). Стэфан з Ёляй на бацькавай гаспадарцы засталіся. Вось і рашыўся я іх праведаць.

Калі пагрукаў у дзверы, ніхто не адказаў, адно з другога боку пачуўся з'едлівы брэх сабакі. Праз хвіліну ў дзвярах паказаўся гаспадар.

— А, гэта ты, Валодзька...Заходзь...

У кухні прывітала нас цішыня.

— Ёля да бацькоў пайшла, — патлумачыў швагер. — Прылёг затым і здрамнуў. Сёння Благавешчанне ...

— Ды як жа вам на гаспадарцы жывецца? — пытаю сваяка, калі заселі пры гарбаце.

— Ледзь канцы з канцамі зводзім, — адказвае суразмоўца. — Еўрасаюзныя датацыі выручаюць. Праўда, цэны напрадвесні павысіліся, але зараз зноў падаюць. Пшаніцу (бульбу таксама) месяц таму ў Бельску прадавалі па 100 злотых, зараз па 80 цэняць. І кліента трэба падшукаць. З іншым збожжам таксама...

— Чым тады займаешся?

— У асноўным на жывёлагадоўлю разлічваем. Маем пяць дойных кароў. Тры штукі маладняку. Гадавы малочны ліміт васемнаццаць тысяч літраў выкарыстоўваем. З мінулага года засталося адно чатырыста літраў. Малако пастаўляем у Бельскі малочны кааператыў. За літр плацяць па 1,15 зл. Паколькі сваім кормам карыстаемся, тады нейкая выручка застаецца. Апрача таго поле пшаніцай і мяшанкай засяваю, — канстатуе субяседнік. — Гэтую апошнюю ў асноўным прызначаю на корм. Што застанецца, на рынку прадаю...

— Як вялікая твая гаспадарка?

— З арэндай адзінаццаць будзе...

— І сам з работай спраўляешся?

— Ёля памагае. Яна кароў даглядае, я ў полі займаюся. Калі спатрэбіцца, дык сядае на машыну і палявыя работы выконвае. Малайчына яна...

У размове хутка прайшоў час. Набліжалася дванаццатая гадзіна. Пара ў дарогу збірацца. Развітаўшыся са шваграм, падаюся ў Райкі, дзе чакала мяне чарговая сустрэча.

Адгаданка

1. вялікі вакальны гурт, 2. лясная пеўчая птушка атрада вераб'іных (*Turdus*), 3. прозвішча аўтара „Чумы", 4. тоўстая вяроўка, 5. грубы парушальнік грамадскага парадку, 6. мангольскі цар, 7. частка храма, абмежаваная радам калон, 8. царкоўны абрад крыжападобнага змазвання чала асвячоным алеем пры ўвядзенні ў сан, 9. пасудзіна для заваркі чаю, 10. геаметрычнае цела, якое ўтвараецца вярчэннем прамавугольнага трохвугольніка вакол аднаго з яго катэтаў.



Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з літарай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Сяргея Абламейкі.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 16 нумара

Аліва, гонг, калій, мячэць, пакт, пані, перыяд, стол, туга, Шырма.

Рашэнне: **Нават лісток паперы лягчэйшы, калі яго паднімаць гуртам.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

22.05 — 28.05

(22.03. — 20.04.) Здабудзешся на рэчы немагчымыя для іншых. Папукаціцца твой кашалёк, будзеш баявіты, кемлівы. 21-25.05. вельмі ўдалыя рамантычныя сустрэчы. Усё, што добрае, цябе не абміне. Ды 23-27.05. магчымая вострая спрэчка з шэфам, якая нікому не прынясе карысці. Твае патрабаванні могуць быць неабгрунтаваныя, а ацэнкі памылковыя і несправядлівыя.

(21.04. — 21.05.) Да 23.05. усе за табою будуць проста шалець! Ды пад канец мая хтось больш ад цябе моцны паставіць пад выпрабаванне тваю цярплівасць. Хоць апошняя дэкада мая вельмі карысная для тваіх фінансаў.

(22.05. — 22.06.) З 21.05. ажыўляльны ўплыў Сонца. Да 22.03. нічога перад табою не схаваецца! Схіліш усіх на свой бок. Будзеш завяршаць справы, канчаць планаванне. Рэгенеруй сілы. Захопіць цябе штосьці, чаго раней не прабаваў. Новыя шанцы і выклікі. Рэалізуй! Пі свежыя сокі і ваду, адмаўляйся ад салонага і салодкага.

(23.06. — 23.07.) Час працы і ўзнагарод, хопіць прыгод і сардэчных хваляванняў. Магчымы фантастычны скок у кар'еры, але і перапасоўкі ў групе сяброў. Дзецям можа ціснуць лішняя дысцыпліна. У курацыі спрабуй чагосьці простага, чаго раней не прымяняў. 25-29.05. могуць быць зусім немагчымыя выезды; доўгія турботы на працы ці ў школе.

(24.07. — 23.08.) Знойдзеш урэшце час для сяброў. Займайся чымсьці для цябе прыемным. 23-27.05. зловіш новыя ідэі і творча іх выкарыстаеш. Ды да 25.05. магчымы закалот і шмат прыкрых непаразуменняў, можаш нарвацца на агромныя перашкоды.

(24.08. — 23.09.) Вопыт з падарожжаў выкарыстаеш пасля на працы ці ў школе, якая ахопіць цябе поўнасцю. Ды да 24.05. не фарсіруйся і не правярай сваёй моцы. Часу не ашчадзіш, бо больш будзеш адпачываць пасля. Пад канец мая на працы можа здарыцца штосьці, да чаго ты непадрыхтаваны. Твае аргументы не прамовяць да нікога!

(24.09. — 23.10.) Да 23.05. у цябе многа сілы, каб кіраваць усім па-твойму. Вельмі добры час на рамантычныя сустрэчы — да 26 мая. Да 24.05. усё, што вырашыш — здзейсніцца. Ды з 27.05. (да 30.05.) выявяцца ўсе запальныя пункты ў тваёй пары. І ў хаце не ўсё пойдзе гладка. Будуць вялікія выдаткі або знойдзецца асоба, якой цяжкі характар залезе табе за скуру (не паддавайся!).

(24.10. — 22.11.) Да 23.05. будзеш вельмі ажыўлены, баявіты і паспяховы. Будзеш мець моцную падтрымку і апеку атачэння, мілыя і рамантычныя моманты. Сардэчныя сеткі закінеш на каго хочаш! Ды з 24-27.05. не шаржуй і больш дбай аб здароўе.

(23.11. — 22.12.) 25-29.05. можаш дацца намовіцца на штосьці, ад чаго лепш табе трымацца здалёк! Можа моцна дакучаць табе адзінота. У апошнія дні мая найцяжэйшыя рашэнні ўжо будуць за табою; магчымасць дадатковага заробку. Стральцы з 14-18.12. — не бойцеся рызыкі!

(23.12. — 20.01.) Калі плануеш рамонт ці новы праект, хопіць табе ўявы і таленту; справішся пры паспяховай падтрымцы сяброў. Можаш шмат зарабіць, але і страціць (не думай: лёгка прыйшло, лёгка пайшло! — нагоды могуць хутка не паўтарыцца). Турбаваць будуць цябе розныя адкладзеныя справы, часам замеценыя пад дыван.

(21.01. — 19.02.) З 21.05. пачнеш рэалізаваць свае мары і дасягнеш намечаных мэт. 26-28.05. не ўводзь ніякіх змен і дбай аб кожную дэталь. Адчуваць сябе будзеш вельмі добра, ды больш варушыся.

(20.02. — 21.03.) Будзь вельмі асцярожным пры прапановах, каб не зрабіць цяжкай да паладжання памылкі. Даведаешся, хто твой сапраўдны сябра, а хто толькі цябе зводзіць (хутчэй лепш мець сапраўдных ворагаў, чым фальшывых сяброў!). Ды яшчэ можа аднавіцца старая кантузія... І не засяроджвайся так на маёмасці, бо можаш страціць важнейшае.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

Злева: Пятро Крук, Міхась Куптэль і Лена Глагоўская

Злева: Галена Тапалянская, Яніна Чарнякевіч

Зміцер Вайцюшкевіч

Злева: Міхал Лісоўскі, консул РБ у Беластоку Таццяна Нікалаёнак, дырэктар Культурнага цэнтра Беларусі у Беластоку Аляксандр Карачун

Злева: Жэня Мартынюк і Ірэна Лукша

Вера і Георгій Валкавыцкія з дачкой Галінай (сядзяць)

Намеснік прэзідэнта Беластока Аляксандр Сасна сярод настаўніц беларускага садка

Злева: Марыя Паўлючук і Галіна Рамашка

Васіль Петручук

Гайнаўка 14.05.2011 г.

Шаноўная Рэдакцыйная Калегія тыднёвіка «Ніва»,

прыміце самыя шчырыя і сардэчныя віншаванні з нагоды Вашага свята 55-годдзя выдавецкай дзейнасці.

На працягу шматлікіх гадоў Вы з’яўляецеся неадлучным і вельмі важным звяном у жыцці беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы. Вы, як сейбіты і прапагандысты беларускага слова, культуры і асветы не дазваляеце загінуць спадчыне продкаў, а таксама адлюстроўваеце вобраз сучаснага жыцця. Мы, педагогі, асабліва цэнім Ваш уклад у фарміраванне характару і выхаванне маладога чалавека ў духу любові да роднага слова. Вашая дзейнасць не раз была імпульсам і аказалася інспірацыяй у развіцці творчых талентаў нашай моладзі.

Жадаем Вам далейшых поспехаў і многіх гадоў плённай працы!

Дырэкцыя, настаўнікі і вучні Белгімназіі і Белліцэя ў Гайнаўцы

Беласток 14.05.2011 г.

Шаноўныя айцы-заснавальнікі тыднёвіка беларусаў у Польшчы, паважаныя сённяшнія ніўцы і ўсе, хто спрычыніўся да таго, што „Ніва” з беларусамі, не толькі ў Польшчы, але і ва ўсім свеце ўжо больш паўстагоддзя!

Ад імя Аб’яднання ў карысць дзяцей і моладзі, якія вывучаюць беларускую мову вітаю Вас з Вашым 55-годдзем. Вашае свята, гэта і нашае свята!

„Ніва” — адзін з самых моцных слядоў беларускасці на Беласточчыне. З 1956 года вашая газета — пастаянны госць у многіх дамах і школах. На ёй усе мы, пачынаючы з „Зоркі”, вучыліся беларускай літаратурнай мове, а цяпер могуць гэта рабіць нашыя дзеці. Няма бадай у нас ніводнай беларускай сям’і, якая б не злічала часу паводле ніўскага календара. „Ніва” знаёміла і знаёміць са штодзённым жыццём беларусаў Польшчы і тых нашых суайчыннікаў, якія воляй лёсу раскіданыя па свеце з сённяшнім днём Беларусі і нашай багатай гісторыяй. Заглядае на сталічныя салоны і ў такія мясцовасці, дзе ніколі не бываюць журналісты іншых выданняў. На старонках тыднёвіка пачыналі свой шлях не толькі вядомыя журналісты, але і славутыя літаратары ды масцітыя прафесары.

„Ніва”, гэта не толькі газета. Гэта сапраўдны інстытут беларусай культуры ў Беластоку, які выдаў шмат кніг, ініцыяваў многа цікавых адукацыйных праектаў. Але гэта таксама месца, куды заўсёды можна прыйсці і пазнаёміцца з самымі свежымі навінамі з беларускага культурнага жыцця ва ўсім свеце.

Магу смела канстатаваць, што вялікая колькасць тых, хто ў апошнім перапісе насельніцтва Польшчы запісаўся беларусамі, зрабіў гэта дзякуючы „Ніве”. Жадаю вам, дарагія сябры, як і ўсім нам, каб сёлета гэтая лічба была яшчэ большай. Але, незалежна ад гэтага, веру, што „Ніва” надалей будзе праводзіць сваю высакародную місію сярод беларусаў і для беларусаў.

Многія вам леты!

Барбара Пякарская
Старшыня Аб’яднання бацькоў „АБ-БА”

ISSN 0546-1960